Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 ЛІПЕНЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 135 (28245)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Нястомная Цётка – Алаіза Пашкевіч

СТАР. 17



Прыгажосць ад майстра — гораду

СТАР. 20



Праграма тэлебачання на тыдзень

20 КАНАЛАЎ

# УРОКІ БЯСПЕКІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Марыя САШАК тлумачыць сваім дзецям — шасцігадовай Ксеніі і паўтарагадоваму Канстанціну — правілы дарожнага руху на гульнявой пляцоўцы дзіцячага садка №161 у Ленінскім раёне сталіцы.**

ЦЫТАТА ДНЯ



**Алег СЯДЗЕЛЬНІК, дырэктар камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Цэнтр інфармацыйных тэхналогій Мінгарвыканкама»:**

*«У чырвоньскіх жыроўках сумы за жыллёва-камунальныя паслугі паказаны ў падвойным фармаце. Гэта зроблена для таго, каб людзям было прасцей разабрацца ў рахунку-паведамленні. У наступных жыроўках усе сумы пакажуць у дэнамінаваных грашах. Але выніковую лічбу адлюструюць і ў новых, і ў старых рублях — так грамадзянам будзе прасцей арыентавацца».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.07.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9940 | ▼ |
| Еўра | 2,2151 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0313 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0806 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

## ЭВАЛЮЦЫЯ ВЫБАРЧАГА ЗАКАНАДАЎСТВА

**Нацыянальны цэнтр заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь прымаў непасрэдны ўдзел у распрацоўцы і карэкціроўцы палажэнняў Выбарчага кодэкса. Пра тое, як змянялася і як будзе змяняцца выбарчая сістэма ў Беларусі, мы распыталі намесніка дырэктара Цэнтра Уладзіміра ЖАЎНЯКА.**



***— Уладзімір Рыгоравіч, раскажыце пра асноўныя этапы развіцця выбарчага заканадаўства Рэспублікі Беларусь.***

— Перш за ўсё хачу сказаць, што развіццё выбарчага заканадаўства ў любой краіне з'яўляецца адлюстраваннем сацыяльных і палітычных працэсаў, якія ў ёй адбываюцца. Беларусь у гэтым сэнсе не выключэнне. Выбарчае заканадаўства нашай краіны пастаянна развіваецца, каб адпавядаць патрабаванням часу.

Да 2000 года ў Беларусі дзейнічалі чатыры законы, якія вызначалі парадак арганізацыі і правядзення рэферэндумаў, выбараў Прэзідэнта, парламента, дэпутатаў мясцовых Саветаў. Шмат палажэнняў гэтых актаў дубліраваліся. Адзін з іх, Закон Рэспублікі Беларусь «Аб выбарах дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь», наогул не мог выкарыстоўвацца, бо новая рэдакцыя Канстытуцыі Беларусі прадугледжвала стварэнне двухпалатнага парламента, а Вярхоўны Савет, як вы памятаеце, быў аднапалатным. У выніку было прынята рашэнне распрацаваць адзіны акт — Выбарчы кодэкс, які б комплексна рэгуляваў працэдуру правядзення выбараў і рэферэндума з пачатку і да канца. Як паказаў час, гэтае рашэнне было правільным.

СТАР. 4

■ Ці чулі?

## РЭКОРДНАЯ ПРЫГАЖОСЦЬ

**У пачатку ліпеня на першай паласе «Звязды» выйшаў матэрыял пад назвай «Залацісты пасаг». На здымку — жыхарка Рагачова Міла Бугаева, як мы пазначылі, — «уладальніца ці не самай доўгай у краіне касы». Сапраўды, валасы даўжынёй амаль у паўтара метра — ну дзе яшчэ такое пабачыш? Але праз некаторы час у рэдакцыі раздаўся званок. «Як жа так? У нашай калегі валасы нашмат даўжэйшыя!» — казалі ўзрушаныя жанчыны. Што ж, супрацоўнікам газеты засталося засумнявацца ва ўласнай дасведчанасці ў гэтым пытанні... І, вядома, адправіць да рэкардсменкі карэспандэнтаў!**



Таццяна Яўсейчык родам са Случчыны, працуе ў гарадскім тэрытарыяльным цэнтры сацабслугоўвання насельніцтва на пасадзе спецыяліста па сацыяльнай рабоце. Упершыню гледзячы на жанчыну і не скажаш, што даўжыня яе валасоў складае... 165 сантыметраў! Звычайная жаночая прычоска, валасы акуратна сабраныя на патыліцы... Хіба што вельмі роўная пастава можа намякаць на процівагу, якую гаспадыня шыкоўнай касы носіць за спінай.

— Шчыра сказаць, пра мае валасы раней увогуле мала хто ведаў, — кажа Таццяна. — Нават сваякі: стрыечныя браты, сёстры прыязджалі ў госці і не былі ў курсе. Усё пачалося, калі мне было гадоў 13, я тады яшчэ насіла карэ. Неяк падумала, што хацела б сабе доўгія валасы. З таго часу я павольна іх адрошчвала, часам даволі значна падразала і ніколі не імкнулася да нейкіх рэкордных паказчыкаў. Гэта ні ў якім разе не самамэта, проста так склалася. Тое, што ў выніку яны сталі паўтараметровымі — чыстая выпадковасць і падарунак прыроды. Думаю, усё залежыць ад генаў, бо ў бабулі і ў мамы таксама былі добрыя валасы.

СТАР. 8

# «СУСВЕТНЫ ФЕСТЫВАЛЬ» І «АСТРАВОК» МІРУ

**Учора позна ўвечары адбылося ўрачыстае адкрыццё XXV, юбілейнага Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». У мерапрыемстве прыняў удзел Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.**

А ўдзень, да цырымоніі адкрыцця, у Віцебску адбыўся «круглы стол» «Культура і мастацтва як крыніца развіцця духоўна-маральных каштоўнасцяў. Роля СМІ ў фарміраванні агульнай культурнай прасторы славянскіх народаў». Гэтае мерапрыемства ўпершыню арганізавалі летась. Такім чынам, становіцца традыцыяй інтэлектуальная дыскусія прадстаўнікоў культуры, СМІ, высокапастаўленых чыноўнікаў. І толькі на першы погляд яно «камернае», цікавае для спецыялістаў. Падчас абмеркавання агучваюцца тэмы, праблемы, якія тычацца кожнага з нас.

**Міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ** падзялілася прыемнымі ўражаннямі ад горада, у якім правіць баль атмасфера свята. Падкрэсліла, што праўду кажуць тыя, хто называе фэст «сусветным». Бо гэта адпавядае рэчаіснасці. Яна нагадала, што сёлета на фестывалі прадстаўнікі 45 краін. І ён адзін з маштабных культурных праектаў, якія ажыццяўляюцца ў Беларусі. У прыватнасці, горад Гродна чарговы раз прыняў фэст нацыянальных культур. Зусім нядаўна Александрыя збірала сяброў. Ідзе падрыхтоўка да Дня беларускага пісьменства, які адбудзецца ў верасні.

Усе гэтыя святы, апроч іншага, спрыяюць супрацоўніцтву, збліжэнню народаў.

— У Беларусі ёсць свая місія ў вялікім і складаным свеце — выбудоўваць масты сяброўства, быць у эпіцэнтры інтэграцыйных працэсаў. І, канешне ж, гэта вызначаецца знешняй палітыкай краіны, у сацыяльна-культурнай сферы, — сказала міністр інфармацыі.

**Старшыня Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Генадзь ДАВЫДЗЬКА** канстатаваў, што «Славянскі базар у Віцебску» — адзін з беларускіх брэндаў, якімі можна ганарыцца.

— Памятаю час, калі многія «зоркі» прыязджаючы сюды, быццам рабілі ласку. А цяпер лічаць за гонар выступіць тут. Мы ганарымся гэтым фэстам, як і лепшай беларускай прадукцыяй, спартыўнымі дасягненнямі... І, калі паразважаць, «базар» патрэбны не толькі нам, а ўсяму свету. Няхай на ім сустракаюцца прэзідэнты: ад Расіі, Украіны да ЗША, каб абмеркаваць праблемныя пытанні! У Беларусі яны пры жаданні змогуць знайсці агульную мову. Бо яна — астравок міру і прыклад добрасуседства, — разважаў Генадзь Давыдзька.

Папулярны спявак, **лаўрэат міжнародных конкурсаў Пётр ЯЛФІМАЎ** адзначыў унікальнасць фестывалю, асабліва — конкурсу маладых выканаўцаў.

— Былі прапановы зрабіць шоу. Але ў выніку конкурс выканаўцаў эстраднай песні застаецца менавіта Конкурсам з вялікай літары. Яго ўдзельнікі ведаюць, што ў Віцебску не будуць ацэньваць скачкі і спецэфекты. Бо галоўнае — выканаўчае майстэрства, вакал. Ганаруся, што гэты конкурс у нас у Беларусі, — сказаў ён.

Падчас «круглага стала» былі агучаны планы і прапановы. У прыватнасці, ёсць ідэя зрабіць буклет з папярэдняй назвай «Прэса на Славянскім базары. 25 гадоў». І чаму б, як на некаторых замежных фэстах, не праводзіць навуковыя канферэнцыі з дакладамі па розных тэмах? Каб «трымаць пульс» на «хвалі тэндэнцый» культуры. Каб павышаць інтэлектуальны ўзровень гледача, слухача.

Усе спікеры адзначылі высокую ролю культуры ў інтэлектуальным і духоўным развіцці чалавека. Падрабязнасці ў адным з наступных нумароў «Звязды».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**



Фота Віктара НІКАЛАЕВА

■ Камунальныя стасункі

# ЛЕПШ ЗАПЛАЦІЦЬ

**Тэма злосных неплацельшчыкаў за жыллё ўздымалася камунальнікамі ўжо даўно, аднак праблема спагнання грошай вырашаецца даволі доўга і складана. Дакладней, раней доўга вырашалася...**

Справа ў тым, што з першых дзён ліпеня ўсе непрыватызаваныя кватэры трапілі ў разрад арэнднага жылля. Тут асобна заўважу, што большая частка такіх неплацельшчыкаў свае кватэры ва ўласнасць не афармляла. Алгарытм працы з тымі, хто не плаціць, вядомы. Праўда, у адрозненне ад прыватных кватэр, санкцыі да жыхароў здымнага жылля значна больш жорсткія. Арэнднага жылля можна пазбавіцца ўжо пры запазычанасці тэрмінам у два месяцы. Прычым наймальнік можа быць выселены без прадастаўлення іншага памяшкання.

Вельмі напружаная сітуацыя з аплатай ЖКП назіраецца ў Мінску, дзе даўгі перад эксплуатацыйнымі службамі маюць дзясяткі тысяч жыхароў. Паводле інфармацыі **намесніка генеральнага дырэктара дзяржаўнага аб'яднання «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Галіны ГІЛЕВІЧ,** у сталіцы пратэрмінаваная запазычанасць насельніцтва па аплаце за жыллёва-камунальныя паслугі павялічылася з пачатку года амаль удвая: з 10 млрд (недэнамінаваных рублёў) на 1 студзеня да 19,7 млрд (недэнамінаваных) на бягучы момант.

Спецыялісі удакладнілі, што пратэрмінаваная запазычанасць вылічваецца за перыяд ад 2 месяцаў і больш. Усяго доўг перад камунальнай гаспадаркай лічыцца ў 34,5 тысячы асабовых рахункаў (на 1 студзеня іх колькасць складала 26 тысяч). Паводле слоў намесніка гендырэктара аб'яднання, цяпер у судах сталіцы разглядаецца 10 спраў аб высяленні неплацельшчыкаў за камунальныя паслугі. Акрамя таго, у судах знаходзяцца і 367 іскаў па даўгах. Дарэчы, эксперты камунальнай службы амаль упэўнены, што калі неплацельшчыкі не пачнуць актыўна гасіць даўгі, то ўжо да канца года колькасць вызваленых такім чынам кватэр пойдзе на сотні.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне члену Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Берасневай А.П. у сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

**РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» выказвае глыбокія спачуванні члену Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Берасневай А.П. у сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

■ Прыёмная кампанія—2016

# Тры гадзіны цішыні...

**Учора а 18-й гадзіне дзверы прыёмных камісій у вышэйшых навучальных установах зачыніліся. Сёлета, каб вызначыцца з месцам сваёй вучобы, у абітурыентаў, што прэтэндавалі на бюджэтную форму навучання, было сем дзён. А 15-й гадзіне прыёмныя камісіі апошні раз абнавілі інфармацыю аб ходзе падачы дакументаў. Далей — тры гадзіны цішыні, якія для многіх аказаліся самым складаным часам. Ёсць меркаванне, што ў апошні момант падаюць свае дакументы толькі абітурыенты з невысокай сумай балаў, якія вагаюцца да апошняга дня, спрабуючы падлічыць шанцы на паступленне на розныя спецыяльнасці: яны забіраюць свае дакументы і нясуць іх у іншыя ВНУ. Малады людзей, якія спрабуюць ускочыць у апошні вагон, насамрэч хапае. Але хвалююцца, нават плачуць, і абітурыенты з баламі, набліжанымі да прахаднога. Многія не вытрымліваюць нервовага напружання і забіраюць свае дакументы...**

## Маўчанне — не на карысць

**Рэктар Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта Наталля БАРАНАВА** прапаноўвала не закрываць для абітурыентаў статыстыку падачы дакументаў у 15.00 і прыводзіла рэальны прыклад: летась за тры гадзіны да закрыцця прыёмнай камісіі прахадны бал на аддзяленне кітайскай мовы ва ўніверсітэце зменшыўся з 366 да 321, таму што абітурыенты на ўсяляк выпадак забралі свае дакументы і падалі іх на спецыяльнасць па асноўнай замежнай мове, якую яны вывучалі ў школе. А кітайскую мову вырашылі выбраць ужо другой замежнай мовай для вывучэння.

Прапаноўвалася таксама весці інфармаванне абітурыентаў у рэжыме анлайн, як гэта робіцца ў МДЛУ (гэта значыць, абнаўляць інфармацыю не адзін раз у тры гадзіны, а пастаянна, па меры падачы дакументаў), і ўкараніць у практыку работы прыёмных камісій інфармаванне абітурыентаў пра бягучы прахадны бал. Пакуль што ў табліцах прыводзіцца колькасць абітурыентаў з баламі ў межах 301—310, 321—330, 341—350 і гэтак далей. Але для тых, хто паступае, гэтай інфармацыі недастаткова. Такая мера дапамагла б зменшыць напружанне на востра запатрабаваных у абітурыентаў спецыяльнасцях у апошнія дні. Але, на жаль, да гэтых прапаноў у Міністэрстве адукацыі пакуль што не прыслухаліся...

## Новыя рэкорды ў БДУ

Між іншым, абітурыентам Белдзяржуніверсітэта пашанцавала: статыстыка аб ходзе падачы дакументаў тут утрымлівае і інфармацыю пра бягучы прахадны бал. Па стане на 12 гадзін учарашняга дня было, напрыклад, вядома, што самыя высокія прахадныя балы складваюцца ў гэтым годзе на факультэце міжнародных адносін: так, на спецыяльнасці «лінгвакраіназнаўства» змогуць прэтэндаваць на бюджэтную форму навучання абітурыенты з сумай балаў не менш як 384, на кірунку «міжнародныя адносіны, міжнароднае права» — не менш як 380.

Бягучы прахадны бал на спецыяльнасць «паліталогія» — 368, «інфармацыя і камунікацыя» ў Інстытуце журналістыкі — 362, «мытная справа» — 340, на кірунак «менеджмент у сферы міжнароднага турызму, сусветная эканоміка» — 363, кірунак «правазнаўства, эканамічнае права» — 352.

На прыродазнаўчых факультэтах і факультэтах дакладных навук бягучыя прахадныя балы былі больш сціплыя. Напрыклад, на факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі — 297, але менавіта сюды падалі свае дакументы абітурыенты з вельмі высокімі баламі: 40 чалавек знаходзяцца ў дыяпазоне ад 361 да 370 балаў, 17 чалавек маюць ад 371 да 380, 10 чалавек — ад 381 да 390 балаў, а два чалавекі і ўвогуле могуць пахваліцца проста фантастычнымі вынікамі — больш як 390 балаў. Так, у багажы выпускніка сталічнай гімназіі №61 Уладзіслава Рэнтовіча — тры стабальныя сертыфікаты, а ў суме з сярэднім балам атэстата — 399.

З сумных тэндэнцый, якія прасочваюцца сёлета, — адсутнасць конкурсу на фізічны, механіка-матэматычны факультэты і на беларускую філалогію.

## Гульнявая індустрыя: 7 чалавек на месца

Прыёмная камісія БДУІР інфармацыю пра бягучы прахадны бал не прадастаўляе, але ў гэтым і патрэбы няма — у абітурыентаў гэтай ВНУ ёсць адна важная перавага: аўтаматызаваная сістэма, якая дзейнічае тут ужо некалькі гадоў, дазваляе карэктаваць залічэнне ў студэнты ў залежнасці ад расстаноўкі абітурыентаў прыярытэтаў і наяўнасці незапоўненых месцаў на тых ці іншых спецыяльнасцях. У парадку ўбывання прыярытэтаў абітурыент можа пазначыць усе 30 спецыяльнасцяў тэхнікатэхналагічнага профілю і дзве — на інжынерна-эканамічным факультэце. Такім чынам, шанцы застацца за бортам у абітурыентаў БДУІР мінімальныя, калі, вядома, яны не ўказалі ў сваім рэйтынгу толькі адну ці дзве спецыяльнасці.

— Пасля таго, як мы прынялі дакументы ў апошняга абітурыента, я націскаю на кнопку — і залічэнне адбываецца аўтаматычна. Праз секунду мы бачым усе вынікі ў нашай базе, — тлумачыць **рэктар БДУІР Міхаіл БАТУРА.** — Натуральна, пасля гэтага камісія яшчэ раз усё перапраўярае, хоць за час работы сістэмы памылак мы не знаходзілі. Але ўсё роўна яшчэ раз усё пераглядаем і толькі потым вывешваем інфармацыю на ўсеагульны агляд.

За шэсць дзён у прыёмную камісію БДУІР было пададзена 2854 заявы, з якіх на бюджэтную форму навучання — 1839. План прыёму на бюджэт складае 1045 месцаў. У апошні дзень некалькі дзясяткаў чалавек свае дакументы забралі.

Сапраўдны аншлаг у БДУІР назіраецца на спецыяльнасці «інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі (у гульнявой індустрыі)». Набор на яе ажыццяўляецца ўсяго другі год. Летась была прадугледжана толькі платная форма навучання, а ў гэтым годзе адкрыта 10 бюджэтных месцаў. На іх пададзена 73 заявы. На вярхушы рэйтынгу ў абітурыентаў знаходзяцца і спецыяльнасці «праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» — 229 прэтэндэнтаў на 70 бюджэтных месцаў, «інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі ў бізнес-менеджменце» — 46 ахвотных на 15 месцаў, «інфарматыка і тэхналогіі праграмавання» — 167 ахвотных на 50 месцаў.

## Прыярытэты абітурыентаў: праграмаванне, «міжнародныя адносіны» і юрыспрудэнцыя

## Гадзіннік — сотаму медалісту

У Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце план прыёму на дзённую бюджэтную форму навучання складае 820 студэнтаў, што на 4,5% больш, чым у 2015 годзе. Школьным медалістам дадзена права паступаць на педспецыяльнасці без здачы ЦТ — толькі па рэкамендацыі педагагічнага калектыву школы.

Абітурыенты, якія скончылі школу з медалём, прыязджаюць падаваць дакументы з асабістымі запрашэннямі ад рэктара педагагічнага ўніверсітэта. Усяго такія запрашэнні для паступлення ў БДПУ без здачы ЦТ і ўступных выпрабаванняў атрымалі больш як тысяча медалістаў, пераможцаў і прызёраў трэцяга этапу рэспубліканскай алімпіяды з Мінска і Мінскай вобласці.

У БДПУ праходзіць акцыя — кожнаму сотаму з медалістаў уручаюцца эксклюзіўныя гадзіннікі з сімволікай універсітэта, выпушчаныя да 100-годдзя ВНУ, а тысячнаму абітурыенту — флэш-карта з фільмам пра ўніверсітэт. 11 ліпеня шчаслівым уладальнікам флэш-карты «БДПУ — больш чым адукацыя» стаў выпускнік сталічнай школы №30 Аляксандр Сударау, які падаў дакументы на гістарычны факультэт. Хлопец прызнаўся, што вырашыў стаць настаўнікам яшчэ ў дзяцінстве... А 13 ліпеня ва ўрачыстай абстаноўцы рэктар універсітэта Аляксандр Жук уручыў падарунак сотаму медалісту: шчаслівай уладальніцай эксклюзіўнага гадзінніка стала Вераніка Сарока, выпускніца Пугачоўскага вучэбнага комплексу дзіцячы сад—сярэдняя школа Валожынскага раёна.

— Дакументы я падала на фізіка-матэматычны факультэт. У мяне ёсць прыклад для пераймання — мой настаўнік матэматыкі Уладзімір Уладзіміравіч Унучак, які ўсе школьныя гады падтрымліваў і накіроўваў мяне ў выбары прафесіі. Я таксама з'яўляюся прадаўжальніцай педагагічнай дынастыі, паколькі мая маці працуе настаўнікам пачатковых класаў, — расказала без пяці хвілін уладальніца студэнцкага білета вядучай педагагічнай ВНУ Вераніка Сарока.

У апошні дзень падачы дакументаў конкурс у БДПУ склаўся па большасці спецыяльнасцяў. Традыцыйна крыху адставаў фізіка-матэматычны факультэт...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■

■ Стандарты

# УЗНАГАРОДА ЯК СТАРТ ДА НОВЫХ ПАЛЯПШЭННЯЎ

**У Выканаўчым камітэце СНД у Мінску ўручылі прэміі СНД 2015 года за дасягненні ў галіне якасці прадукцыі і паслуг. Сярод пераможцаў — лепшыя арганізацыі з дзяржаў — удзельніц Садружнасці: Арменія, Беларусь, Казахстан, Кыргызстан і Расія.**

Па выніках пятага конкурсу званне лаўрэата прысвоена СТАА «Бел-Пласт Інтэрнэшнл» (Беларусь), ТАА Навукова-вытворчая фірма «Пакер» (Расія), ТАА «Кыргыз Коньяры» (Кыргызстан), ЗАТ «Ерэванскі каньячны завод» (Арменія), ГУП санаторый «Янган-тау» (Расія), Маскоўскаму дзяржаўнаму медыка-стаматалагічнаму ўніверсітэту імя А.І. Еўдакімава (Расія).

Дыпламантамі прэміі СНД 2015 года сталі пяць беларускіх прадпрыемстваў: ТАА «Франдэса», ТАА «Біякам», ААТ «Лідскі малочна-кансервавы камбінат», ЗАТ «Белзамежбуд», Адасобленае структурнае падраздзяленне «Лакаматыўнае дэпо Мінск» транспартнага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Мінскае аддзяленне Беларускай чыгункі», а таксама АТ «РЗА» (Казахстан).

«Конкурс, які праводзіцца ў СНД, арыентаваны на падтрыманне міждзяржаўных эканамічных сувязяў, — падкрэсліў дырэктар Бюро па стандартах — адказны сакратар Міждзяржаўнага савета па стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі дзяржаў — удзельніц СНД Мікалай Санец. — Наступным узроўнем для прадпрыемства з'яўляецца выхад на міжнародныя рынкі. У прыватнасці, мадэль і крытэрыі ацэнкі пераможцаў конкурсу максімальна гарманізаваны з еўрапейскімі. І тыя прадпрыемствы, якія прайшлі наш конкурс, выходзяць на еўрапейскі».

Прэмія СНД за дасягненні ў галіне якасці прадукцыі і паслуг прысуджаецца адзін раз у два гады на конкурснай аснове арганізацыям дзяржаў Садружнасці за дасягненне значных вынікаў у галіне якасці прадукцыі і паслуг, забеспячэнне іх бяспекі, а таксама ўкараненне сучасных метадаў менеджменту якасці.

Галоўнымі крытэрыямі з'яўляюцца пацвярджэнне высокай якасці выпускаемай прадукцыі або аказваемай паслугі на працягу не менш за два гады і ажыццяўленне экспарту прадукцыі і паслуг не менш як у дзве дзяржавы — удзельніцы СНД.

— Усе лаўрэаты, якія атрымалі ўзнагароды сёлета, — годныя прадпрыемствы. Яны прадстаўляюць розныя сферы вытворчасці прадукцыі і аказання паслуг. Радуе, што разгорнуты пласт арганізацый праяўляе цікавасць да гэтага конкурсу, — пракаментаваў старшыня Дзяржстандарта Віктар Назаранка. — Беларуская прамысловасць была і застанецца актыўным яго ўдзельнікам.

**Дар'я ШОЦІК.**

■ Стыхія

# НЕЎТАЙМОЎНЫЯ НЯБЁСЫ

## Пасля непрацяглай перадышкі ўжо ў нядзелю да нас ізноў прыйдуць моцны дождж, парывісты вецер і нават град

**Два мінулыя дні запар моцныя дажджы са смерчамі гаспадарылі практычна паўсюдна па краіне. А потым стыхія вырашыла ўзяць тайм-аўт. Сіноптыкі Белгідраметэацэнтра паведамляюць, што сёння на тэрыторыі Беларусі надвор'ем будуць кіраваць ужо не такія небяспечныя атмасферныя франты цыклону з цэнтрам над Літвой.**

Таму чакаецца воблачна з праясненнямі. На большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі прагрымяць навальніцы. Вецер паўднёвы з пераходам на заходні ўмераны, месцамі моцны парывісты. Максімальная тэмпература паветра складзе плюс 17— 24 градусы, па ўсходзе краіны — 25—29 цяпла, а месцамі па ўсходзе Магілёўскай і Гомельскай абласцей паветра прагрэецца да плюс 30—31 градуса. Ужо тады атмасферны ціск пачне паціху расці.

Па-сапраўднаму надвор'е супакоіцца ў суботу, калі тэрыторыя нашай краіны трапіць у зону павышанага атмасфернага ціску, які быў сфарміраваны ў паветранай масе ўмераных шырот. Чакаецца пераважна без ападкаў, толькі ўдзень месцамі па поўдні пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Мінімальная тэмпература паветра ўначы складзе 9—16 цяпла, а максімальная ўдзень — плюс 19—26 градусаў, па паўднёвым усходзе — 25—29 градусаў.

Аднак, паводле прагнозаў айчынных сіноптыкаў, перадышка будзе нядоўгай. Ужо ў нядзелю да нас завітае чарговая хваля цёплых няўстойлівых паветраных мас, якія змяшчаюцца з тэрыторыі Украіны. Таму ўначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы, прагрымяць навальніцы. Удзень у асобных раёнах пры навальніцах чакаюцца моцныя дажджы, магчымы град і рэзкі парывісты вецер. Чакаецца, што тэмпература паветра ўначы складзе 10—17 цяпла, удзень — 21—28; па паўднёвым усходзе ўначы — 18—21 цяпла, удзень — плюс 29—34 градусы.

### АПАДКІ — ПАЛОВА МЕСЯЧНАЙ НОРМЫ

Сіноптыкі падвялі папярэднія вынікі серады, калі на працягу сутак назіраліся складаныя ўмовы надвор'я. Тады ўдзень на большай частцы тэрыторыі прайшлі навальнічныя дажджы, пераважна па паўночна-заходняй палове краіны адзначаліся моцныя лівені, у асобных раёнах пры навальніцах назіралася шквалістае ўзмацненне ветру парывамі да 15—21 м/с (21 м/с у Беразіно), дзе-ніздзе выпадаў град.

Найбольшая колькасць ападкаў выпала на метэастанцыях Навагрудак — 43 мм (47% месячнай нормы), Ліда — 39 мм (50%). Уначы месцамі прайшлі кароткачасовыя дажджы рознай інтэнсіўнасці, адзначаліся навальніцы. Максімальная тэмпература паветра ў сераду ўдзень склала 18—20 цяпла на паўночным захадзе, а па паўднёвым усходзе дасягала плюс 33—35 градусаў. Мінімальная тэмпература ўначы была 12—19 цяпла, а па паўночным захадзе яна не перавышала плюс 10—11 градусаў. Эксперты Белгідраметэацэнтра адзначаюць у гэтыя суткі сапраўды кантрасныя ўмовы, калі сярэднясутачная тэмпература за 13 ліпеня знаходзілася ў межах 16—26 цяпла, што ў асноўным на 1—8 градусаў вышэй за кліматычную норму, толькі на паўночным захадзе тэмпературны фон быў нават на 1—2 градусы ніжэй за яе. Вось такая вялікая ў нас краіна...

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*







Фота БЕЛТА.

■ Даляглядзы

# Пра нашу літаратуру — таджыкскаму чытачу

## ПРЭЗЕНТАВАНЫ БЕЛАРУСКІ ВЫПУСК ТАДЖЫКСКАГА ЧАСОПІСА «ПАМІР»

**Імпрэза прайшла ў канферэнц-зале Выдавецкага дома «Звязда».**

Другі нумар літаратурна-мастацкага, грамадска-палітычнага часопіса Саюза пісьменнікаў Таджыкістана «Памір», які выйшаў сёлета, мае на мэце знаёмства чытача з сучаснай паэзіяй і прозай Беларусі. У перакладзе на рускую мову тут прадстаўлены творы каля 20 нашых сучаснікаў. Гэта Мікола Мятліцкі, Анатоль Аўруцін, Лізавета Палеес, Алесь Бадак, Міхась Башлакоў, Навум Гальпяровіч, Валерый Грышкавец, Васіль Зуёнак, Казімір Камейша, Георгій Кісялёў, Васіль Макарэвіч, Юрый Мацюшка, Уладзімір Мазго, Генадзь Пашкоў, Міхась Пазнякоў, Алесь Жук, Алег Ждан і іншыя аўтары, якія актыўна публікуюцца ў літаратурна-мастацкіх выданнях Беларусі і могуць лічыцца выдатнымі прадстаўнікамі сучаснага літаратурнага працэсу нашай краіны. Дарэчы, некаторыя творы, чые вершы і проза пабачылі свет у новым выпуску «Паміра», — а гэта Міхась Пазнякоў і Навум Гальпяровіч — таксама прысутнічалі на прэзентацыі.

Адметна, што прэзентаваны выпуск «Паміра» — не першы сумесны праект Беларусі і Таджыкістана ў галіне літаратурнай дружбы. Падчас прэзентацыі **Казідаўлат КАІМДОДАЎ, Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Таджыкістана ў Беларусі,** зазначыў:

— Сёлета мы адзначаем 20-годдзе ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж нашымі дзяржавамі. Беларусь і Таджыкістан звязваюць доўгія гады моцнага сяброўства, адметнасць нашых стасункаў — узаемаразуменне, узаемадапамога, шчырасць. Сёння мы з'яўляемся стратэгічнымі партнёрамі, але і культурнае, літаратурнае супрацоўніцтва — таксама адна з галоўных сфер нашай дзейнасці. Гэта аснова, што стварае пазітыўныя перадумовы для ўмацавання і пашырэння ўзаемааднасін у іншых сферах.

**«Адказам беларускага боку калегам з Таджыкістана стане восьмы нумар часопіса «Нёман», які сёлета будзе прысвечаны таджыкскай літаратуры».**

Існуе мноства творчых судакрананняў, якія аб'ядноўваюць беларускі і таджыкскі народы і літаратуры. Як падкрэсліў пасол, абедзвюм літаратурам уласціва моцная гістарычная памяць, шчырае імкненне да ісціны. Так, з 1918-га па 1986 год у Мінску выдадзена 10 кніг у перакладзе з таджыкскай на беларускую мову, а ў Душанбэ — 24 выданні беларускіх аўтараў на таджыкскай мове. У другім дзесяцігоддзі XXI стагоддзя дзякуючы многім сустрэчам, праектам супрацоўніцтва працягваецца, у Таджыкістане сёння вядомыя імёны многіх айчынных літаратараў. З 2008 года там выдадзена каля 10 кніг беларускіх аўтараў у перакладзе на таджыкскую мову, а ў 2009 годзе пабачыла свет анталогія сучаснай беларускай літаратуры на таджыкскай мове, дзе было прадстаўлена каля 30 аўтараў.

Часопіс «Памір» — адзін з найстарэйшых літаратурных рускамоўных часопісаў сярэднеазіяцкага рэгіёна. Ён пачаў выдавацца пасля вайны, у 1946 годзе, быў створаны па ініцыятыве Саюза пісьменнікаў Таджыкістана і ўнёс вялікі ўклад у распаўсюджванне звестак пра таджыкскую літаратуру на прасторах усяго былога СССР. Сучасны часопіс «Памір», хоць крыху зменшыў аб'ём, застаўся верным сваім высакародным традыцыям.

Адметна, што і ў Беларусі ёсць цікавасць да класічнай і сучаснай літаратуры Таджыкістана. У серыі «Сугучча сэрцаў» выйшла кніга «Беларусь — Таджыкістан: Светлая далячынь», на партале «Сугучча», заснаваным Выдавецкім домам «Звязда», існуе асобная старонка «Літаратурны Таджыкістан», дзе размяшчаюцца матэрыялы на беларускай, рускай і таджыкскай мовах. Творы таджыкскіх аўтараў у перастварэнні Ірыны Качатковай, Адама Шостака, Юліі Алейчанкі і іншых перакладчыкаў рэгулярна з'яўляюцца на старонках айчыннай перыёдыкі, а Саюз пісьменнікаў Беларусі і Саюз пісьменнікаў Таджыкістана маюць досыць трывалыя кантакты.

**Алесь КАРЛЮКЕВІЧ, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда», старшыня таварыства дружбы «Беларусь — Таджыкістан»,** расказаў:

— Фармат такой актыўнай працы сведчыць пра тое, што ў пісьменніцкім асяродку ёсць інтарэс да нацыянальных літаратур; штогод адбываюцца падзеі, якія сведчаць пра умацаванне адносін. Гэта таксама адлюстраванне вялікай работы, якая стаіць за кожным з фактаў і праектаў, — праца перакладчыкаў, рэдактараў і рэдакцый літаратурна-мастацкіх выданняў.

**«Беларусь і Таджыкістан звязваюць доўгія гады моцнай дружбы, адметнасць нашых стасункаў — узаемаразуменне, узаемадапамога, шчырасць».**

Адказам беларускага боку калегам з Таджыкістана стане восьмы нумар часопіса «Нёман», які сёлета будзе прысвечаны таджыкскай літаратуры. Як падкрэсліў **галоўны рэдактар гэтага часопіса Аляксей ЧАРОТА,** надзвычай важна прадставіць менавіта сучасную літаратуру Таджыкістана, слаба знаёмую айчыннаму чытачу, пазнаёміць з імёнамі маладых аўтараў.

Але на гэтым супрацоўніцтва не скончыцца, рыхтуецца некалькі сумесных праектаў. Новай яркай старонкай беларуска-таджыкскіх стасункаў стануць Дні культуры Беларусі, што пройдуць у Душанбэ ў верасні, а ў сталіцы Беларусі цяпер рыхтуецца паэтычная вечарына, прысвечаная выдатнаму таджыкскаму аўтару Лаіку Шэралі.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

# ЭВАЛЮЦЫЯ ВЫБАРЧАГА ЗАКАНАДАЎСТВА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— Тым не менш з моманту прыняцця Выбарчага кодэкса ў 2000 годзе ў яго неаднаразова ўносіліся змяненні. Чым была выклікана неабходнасць іх прыняцця?***

— Так, сапраўды за 16 гадоў дзеяння Выбарчага кодэкса было падрыхтавана і прынята 7 законаў, якімі ўносіліся змяненні і дапаўненні ў Кодэкс. Гэта не так і шмат у параўнанні з іншымі кодэксамі.

Трэба разумець, што выбарчае заканадаўства — жывая сфера, якая павінна ўлічваць як вопыт папярэдніх выбараў, так і сучасныя тэндэнцыі развіцця грамадства. Варта адзначыць, што асобныя змяненні ў выбарчым заканадаўстве былі зроблены на падставе рэкамендацый міжнародных назіральнікаў. Беларусь заўсёды запрашала прадстаўнікоў міжнародных арганізацый прыняць удзел у назіранні за выбарамі і з павагай ставілася да іх парад. Напрыклад, найбольш грунтоўныя змяненні ў Выбарчы кодэкс, унесеныя ў 2010 годзе, з'явіліся вынікам сур'ёзнай працы над прапановамі міжнародных назіральнікаў. Але важна падкрэсліць, што немагчыма ўзяць і механічна перанесці вопыт іншых дзяржаў па арганізацыі і правядзенні выбараў на Беларусь. У кожнай краіне свае асаблівасці развіцця нацыянальнага заканадаўства, якія абумоўлены гісторыяй краіны, традыцыямі, менталітэтам людзей. Напрыклад, неадназначна ўспрымаецца вопыт краін, у якіх прадугледжаны абавязак грамадзяніна ўдзельнічаць у выбарах пад пагрозай штрафу. Таму, пры разглядзе замежнага вопыту ў першую чаргу павінны ўлічвацца нацыянальныя інтарэсы.

***— Па якіх напрамках праводзілася карэкціроўка Выбарчага кодэкса?***

— Праца па ўдасканаленні палажэнняў выбарчага заканадаўства праведзена сур'ёзная — значна лібералізованы ўсе этапы выбараў. Калі абагульніць змяненні і дапаўненні, якія ў апошнія гады былі ўнесены ў Выбарчы кодэкс, то можна вылучыць некалькі кірункаў, па якіх праводзілася ўдасканаленне палажэнняў выбарчага заканадаўства.

Па-першае, з мэтай удасканалення парадку фарміравання выбарчых камісій, павышэння іх незалежнасці і самастойнасці прадугледжваецца, што склад камісій (акруговай, тэрытарыяльнай, участковай) павінен, як правіла, не менш чым на адну трэць складацца з прадстаўнікоў палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў, а дзяржаўных служачых, наадварот, не можа быць больш чым адна трэць ад складу камісіі. У Кодэксе дадаткова падкрэсліваецца, што ў склад камісіі не могуць уваходзіць суддзі, пракуроры, кіраўнікі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, а старшынёй камісіі не можа быць асоба, якая падначалена кандыдату ў дэпутаты, або блізкія сваякі кандыдата.

На пасяджэннях органаў, якія ствараюць камісіі, могуць прысутнічаць прадстаўнікі палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў, грамадзян, якія вылучылі сваіх прадстаўнікоў у склад камісіі.

Па-другое, дзеля спрашчэння парадку вылучэння і рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты з Выбарчага кодэкса было выключана палажэнне аб абавязковасці для палітычнай партыі мець сваю арганізацыйную структуру на тэрыторыі выбарчай акругі, ад якой будзе вылучацца яе кандыдат.

Выключана магчымасць адмовы ў рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты ў выпадках прадстаўлення прэтэндэнтамі звестак, якія не адпавядаюць рэчаіснасці, напрыклад, біяграфічных звестак, дэкларацыі аб даходах і маёмасці. Безумоўна, калі гэтая недакладнасць не носіць істотны характар.

Трэці блок змяненняў накіраваны на пашырэнне магчымасцяў перадвыбарчай агітацыі кандыдатаў. Уведзены заяўны (замест дазвольнага) прынцып правядзення масавых мерапрыемстваў падчас перадвыбарчай агітацыі кандыдатамі. Гэта значыць, што кандыдат або яго давераная асоба паведамляе мясцоваму выканаўчаму і распарадчаму органу аб правядзенні мерапрыемства ў пэўным месцы. Згода дзяржаўных органаў не патрэбна, бо пералік месцаў, у якіх кандыдатам можна праводзіць агітацыю, вызначаны мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі па ўзгадненні з выбарчай камісіяй загадзя. Цяпер кандыдаты могуць збіраць подпісы ў форме пікета ў месцах, якія вызначаны мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, таксама без атрымання папярэдняга дазволу.

Цікавым змяненнем уяўляецца магчымасць кандыдатам ствараць індывідуальныя выбарчыя фонды. Фарміравацца такія фонды могуць за кошт асабістых сродкаў кандыдата, а таксама добраахвотных ахвяраванняў. Дарэчы, кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь мінулай восенню карысталіся магчымасцю ствараць такія фонды, але большасць кандыдатаў стварала выбарчыя фонды ў памеры менш за 3% ад максімальна дазволенага.

Наступныя змяненні датычыліся ўдасканалення парадку галасавання і падліку галасоў. У Кодэксе прадугледжана абвяшчэнне вынікаў асобнага падліку галасоў і ўключэнне ў пратакол участковай камісіі звестак аб колькасці выбаршчыкаў, якія прагаласавалі датэрмінова, па месцы знаходжання, а таксама ў дзень выбараў на ўчастку для галасавання. Кандыдаты ў дэпутаты могуць прысутнічаць на ўчастках для галасавання пры падліку галасоў.

Апошні блок змяненняў прадугледжваў удасканаленне парадку разгляду зваротаў, якія адносяцца да выбараў. У прыватнасці, замацаваны абавязак інфармаваць заяўніка аб магчымасці прысутнічаць пры калегіяльным разглядзе яго скаргі выбарчай камісіяй.

***— Напярэдадні выбараў у парламент асобую зацікаўленасць выклікаюць палажэнні Выбарчага кодэкса наконт таго, як будуць праходзіць выбары дэпутатаў. Ці трэба чакаць нечага новага ў параўнанні з папярэднімі выбарамі?***

— Так, у Выбарчы кодэкс былі ўнесены змяненні, мэтай якіх з'яўляецца пэўнае спрашчэнне выбарчай сістэмы. Гэтыя выбары ў Палату прадстаўнікоў будуць праходзіць па мажарытарнай сістэме аднаснай большасці. Гэта значыць, што дэпутатам Палаты прадстаўнікоў стане той кандыдат, які набярэ больш галасоў выбаршчыкаў, чым любы яго сапернік (пры яго наяўнасці), нават калі агульная колькасць галасоў менш за палову. Другога тура на гэтых выбарах не будзе. Трэба адзначыць, што мажарытарная сістэма абсалютнай большасці, выбары па якой праходзілі мінулы раз у парламент, выкарыстоўваецца ў свеце пераважна на выбарах вышэйшых службовых асоб дзяржавы. Гэтыя змяненні павінны зрабіць выбары больш таннымі і хуткімі (за кошт адмовы ад магчымага другога тура). Дарэчы, з 2007 года мажарытарная сістэма аднаснай большасці была апрабавана на выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў і па іх выніках прызнана дастаткова эфектыўнай.

***— Уладзімір Рыгоравіч, ці можна чакаць змен у Выбарчым кодэксе пасля сёлетніх выбараў?***

— Выбарчае заканадаўства, як і заканадаўства наогул, не з'яўляецца статычным, яно павінна гнутка рэагаваць на сусветныя тэндэнцыі, адпавядаць патрабаванням эфектыўнасці і практычнай рэалізацыі. На бліжэйшую будучыню запланавана работа па дэталёвым разглядзе прапаноў міжнародных назіральнікаў аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Выбарчы кодэкс.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

■ Выбары-2016

# УЧАСТКІ ДЛЯ ГАЛАСАВАННЯ ВЫЗНАЧАНЫЯ

## СКЛАД УЧАСТКОВЫХ КАМІСІЙ ПРАЦЯГВАЕ ФАРМІРАВАЦЦА

**Згодна з інфармацыяй Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў, усяго па краіне створана 6 018 участкаў для галасавання па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу шостага склікання. З іх 259 — у санаторыях, прафілакторыях, дамах адпачынку, бальніцах і іншых арганізацыях аховы здароўя, якія аказваюць медыцынскую дапамогу ў стацыянарных умовах, і 21 участак — у воінскіх часцях.**

**У Брэсцкай вобласці** створаны 928 участкаў для галасавання, з іх 35 у санаторыях і бальніцах і адзін у воінскай часці. **На Віцебшчыне** выбаршчыкі прыйдуць аддаць свае галасы на 819 участкаў, з іх — 41 будзе размешчаны ва ўстановах аховы здароўя і 1 — у воінскай часці. **У сталіцы** з 710 утвораных участкаў 28 знаходзяцца ў санаторыях, прафілакторыях і бальніцах, і 6 — у воінскіх часцях.

Акрамя таго, 47 участкаў для галасавання ўтвораны за межамі краіны — у пасольствах і консульствах Беларусі па ўсім свеце.

ЦВК таксама паведаміла пра акрэдытацыю 240 нацыянальных назіральнікаў на выбары дэпутатаў у парламент краіны па стане на 11 ліпеня. Ад палітычных партый акрэдытаваны 21 чалавек, ад грамадскіх аб'яднанняў — 204. Яшчэ 15 грамадзян акрэдытаваліся ў якасці назіральнікаў шляхам падачы адпаведных заяў.

* * *

Дзве скаргі разгледжаны на пасяджэннях **Гомельскай абласной** выбарчай камісіі. Яны паступілі ад асоб, якія маюць намер вылучаца кандыдатамі ў дэпутаты, на дзеянні акруговай выбарчай камісіі Гомельскай-Прамысловай выбарчай акругі №35 і Гомельскай-Цэнтральнай выбарчай акругі №33. Як паведаміў **старшыня абласной выбарчай камісіі Мікалай СТОШ,** у выніку разгляду зваротаў прызнана, што дзеянні акруговых выбарчых камісій не супярэчылі выбарчаму заканадаўству краіны.

Цяпер на Гомельшчыне ўтворана 1038 участкаў для галасавання на выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання. У тым ліку ў санаторыях, прафілакторыях, дамах адпачынку, бальніцах будуць працаваць 40 участкаў для галасавання. Два ўтвораны ў воінскіх часцях. Між тым, у папярэднюю выбарчую кампанію ў Гомельскай вобласці было на 32 участкі больш. Памяншэнне колькасці звязана з узбуйненнем некаторых участкаў.

У Гомельскай вобласці зарэгістраваны 57 ініцыятыўных груп па зборы подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку асоб, прапанаваных для вылучэння кандыдатамі ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу шостага склікання. 40 заяўнікаў — прадстаўнікі беспартыйнага блока, 17 уваходзяць у склад палітычных партый.

Дарэчы, цяпер ідзе фарміраванне ўчастковых выбарчых камісій. Вылучэнне прадстаўнікоў у іх склад павінна закончыцца не пазней чым за 45 дзён да выбараў. Іх колькасць можа складаць ад 5 да 19 чалавек.

* * *

На тэрыторыі **Магілёўскай вобласці** створана 767 участкаў для галасавання па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, паведаміў **старшыня абласной выбарчай камісіі Валерый БЕРАСТАЎ.** З іх 37 знаходзяцца ў бальніцах, санаторыях і іншых установах аховы здароўя. Але спісы для галасавання там вывесяць не за 15 дзён да выбараў, а за два.

У кожным раёне вызначаны месцы, забароненыя для правядзення пікетаў. Азнаёміцца з імі можна на сайтах рай- і гарвыканкамаў. У Магілёве, напрыклад, нельга збіраць подпісы на плошчах Леніна і Славы, у падземных пераходах, на вакзалах, на адлегласці бліжэй чым 50 метраў ад будынкаў мясцовых прадстаўнічых, выканаўчых і распарадчых органаў улады, судоў, органаў пракуратуры, арганізацый, якія забяспечваюць абараназдольнасць, бяспеку дзяржавы і жыццядзейнасць насельніцтва. А таксама на тэрыторыі ўстаноў адукацыі і аховы здароўя.

У Магілёўскай вобласці зарэгістравана 61 ініцыятыўная група па зборы подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку асоб, прапанаваных для вылучэння кандыдатамі ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў. Сярод магчымых прэтэндэнтаў на месца ў парламенце 72,6% з'яўляюцца беспартыйнымі, 11,3% прадстаўнікі Аб'яднанай грамадзянскай партыі, 6,5% — Камуністычнай партыі Беларусі, 3,2% — Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці, па 1,6% — Беларускай партыі левых «Справядлівы свет», Ліберальна-дэмакратычнай партыі і партыі БНФ.

За ходам выбараў на Магілёўшчыне, па звестках на 11 ліпеня, будуць сачыць 17 назіральнікаў.

* * *

**У Мінскай вобласці** ў акружныя выбарчыя камісіі была пададзена 61 заява на рэгістрацыю ініцыятыўных груп выбаршчыкаў, зарэгістравана 59. У рэгістрацыі адмоўлена дзвюм ініцыятыўным групам, якія парушылі дзеючае выбарчае заканадаўства. У прыватнасці, ініцыятыўная група па Пухавіцкай выбарчай акрузе №65 не вытрымала патрабавання па колькасным складзе. Паводле закона для рэгістрацыі неабходна, каб у ініцыятыўную групу ўваходзіла не менш як 10 чалавек, — паведаміў **старшыня Мінскай абласной выбарчай камісіі Вадзім БАНДАРЭНКА.**

Вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты працягнецца па 1 жніўня. Партыі вылучаюць прэтэндэнтаў у кандыдаты на сваіх з'ездах, а калектывы — на сходах (у тым выпадку, калі ў арганізацыі налічваецца не менш як 300 чалавек). Калі калектыў не дацягвае да гэтай колькасці, то вылучэнне адбываецца шляхам аб'яднання некалькіх калектываў.

У акруговых выбарчых камісіях Міншчыны акрэдытаваны 48 назіральнікаў за выбарамі: 5 ад грамадзян, 6 — ад палітычных партый і 37 — ад грамадскіх аб'яднанняў. У ліку найбольш актыўных Камуністычная партыя Беларусі, грамадскае аб'яднанне «Белая Русь», Беларускі Хельсінкскі камітэт, якія вылучылі адпаведна 5, 11 і 10 назіральнікаў. Ад Беларускага рэспубліканскага Саюза моладзі, Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў і Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі акрэдытавана па 5 назіральнікаў.

Усяго на Міншчыне створаны 1023 участкі для галасавання. Іх колькасць па акругах залежыць ад колькасці выбаршчыкаў і кампактнасці пражывання. Напрыклад, у Салігорскай гарадской выбарчай акрузе №68 арганізавана 30 участкаў, а ў Капыльскай акрузе №66 і Бярэзінскай акрузе №61 — 88.

* * *

Паводле інфармацыі **сакратара Гродзенскай абласной выбарчай камісіі Паўла МІХАЛЮКА,** у вобласці ўтворана 686 участкаў для галасавання па 13 акругах. Зарэгістравана 50 ініцыятыўных груп па падтрымцы прэтэндэнтаў на дэпутацкі мандат.

Увогуле заяву на рэгістрацыю падалі на Гродзеншчыне 52 ініцыятыўныя групы, аднак 2 з іх сваю дзейнасць так і не распачалі. У адным выпадку заяву адклікалі, а ў другім у рэгістрацыі было адмоўлена з-за няправільнага афармлення дакументаў.

Сярод вылучэнцаў, чые інтарэсы прадстаўляюць ініцыятыўныя групы, 35 беспартыйных, 4 члены партыі БНФ, па 3 — Аб'яднанай грамадзянскай партыі, Беларускай партыі левых «Справядлівы свет», Ліберальна-дэмакратычнай партыі, па адным — Камуністычнай партыі Беларусі і Беларускай партыі «Зялёныя».

Калі ўсе ахвотныя трапіць у парламент здолеюць сабраць неабходную колькасць подпісаў у сваю падтрымку (не менш за 1000) і будуць зарэгістраваны, то, напрыклад, у Лідскай выбарчай акрузе №55 на дэпутацкі мандат будуць прэтэндаваць 5 чалавек, у Слонімскай №58 і Гродзенскай-Занёманскай №49 — па 6, у Гродзенскай — Цэнтральнай №51 — 7.

Што тычыцца назіральнікаў за ходам выбарчай кампаніі, то па стане на 11 ліпеня зарэгістравацца пажадалі 27 прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый. Дарэчы, у пазычаным сэнсе назіральнікам пазаўчора стаў і аўтар гэтых радкоў, калі да мяне прыйшла па подпіс у падтрымку аднаго з кандыдатаў член яго ініцыятыўнай групы. Магу засведчыць, што ўсе працэдуры выконваліся згодна з заканадаўствам. Мая асабістая пазіцыя наступная: не адмовіць усім, хто хоча ўдзельнічаць у выбарах і звернецца па подпіс, а ўжо ў дзень галасавання камусьці з іх аддаць перавагу.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, Ірына АСТАШКЕВІЧ, Нэлі ЗІГУЛЯ, Тацццяна ЛАЗОЎСКАЯ, Барыс ПРАКОПЧЫК.**



Фота БЕЛТА

# ФЕСТЫВАЛЬ АФІЦЫЙНА СТАРТАВАЎ

**Учора вечарам у Летнім амфітэатры адкрыўся XXV Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Па традыцыі свабодных месцаў у глядзельнай зале не было. Цырымонія афіцыйнага адкрыцця «алімпіяды мастацтваў» прайшла на адным дыханні.**

Тое, што фестываль — важная культурная падзея, пацвярджаюць прывітальныя тэлеграмы ад прэзідэнтаў Расіі, Чэхіі, Славакіі, Балгарыі і іншых краін.

Учора ўпершыню ў ганаровай абстаноўцы каля галоўнай сцэнічнай пляцоўкі «Базару» паднялі сцяг фестывалю. У незабыўнай цырымоніі ўдзельнічалі больш за 200 (!) барабаншчыц, духавыя аркестры, артысты. У цэнтры ўвагі публікі былі два паветраныя шары. Гэтае мерапрыемства ў дырэкцыі плануюць зрабіць традыцыйным.

Зрэшты, стала вядома імя лаўрэата Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення». Сёлета гэтага гонару ўдастоіліся маэстра Міхаіл Фінберг і аркестр, якім ён кіруе.





Фота БЕЛТА.

— Ганаруся тым, што жыву ў Беларусі. Да «Базару» мы працавалі і на фестывалях польскай песні, якія да яго таксама праводзіліся ў Віцебску. Тут сапраўднае свята нацыянальных культур. Вельмі рады, што ў Беларусі захоўваюць песенныя традыцыі, — эмацыянальна падзяліўся радасцю знакаміты дырыжор.

У суботу, 16 ліпеня, на «Базары» — Дзень моладзі. Калі задумацца, то за 25 гадоў правядзення фэсту вырасла цэлае пакаленне. Што яго цікавіць, захапляе? Вось гэта і пакажуць хлопцы і дзяўчаты. У праграме парад маладзёжных субкультур «Беларусь у сэрцы маім!». На плошчы Перамогі на працягу ўсяго дня можна будзе з захапленнем паназіраць за выступленнямі скейтбардыстаў, ролераў, мастакоў бодзі-арту. Сваім мастацтвам падзеляцца барды, выхаванцы танцавальных школ краіны, удзельнікі маладзёжных аркестраў і музычных калектываў. Будзе прадстаўлены і фальклор. Вызначаць нават лепшага бармена.

Шмат цікавага будзе і на самым юным праекце — фестывалі вулічнага мастацтва «На сямі вятрах». Артысты пакажуць перформансы, спектаклі, у тым ліку і «тэатр ценяў».

Распачнецца XIV Міжнародны дзіцячы музычны конкурс «Віцебск-2016». А ў дарослых выканаўцаў адбудзецца першы дзень фіналу конкурсу.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**
*pukshanski@zviazda.by*

**АД РЭДАКЦЫІ.**
**Карэспандэнт «Звязды» Аляксандр Пукшанскі стаў адным з чатырох журналістаў, якім учора ўручылі ганаровую грамату Міністэрства інфармацыі за актыўную плённую працу па асвятленні мерапрыемстваў мінулага фестывалю. Гэта адбылося падчас адкрыцця Міжнароднага прэс-цэнтра.**



## Народная творчасць

# І ПЛЫЎ «ГЛІНЯНЫ ЗВОН» НАД ІВЯНЦОМ

**У мінулую суботу жыхары славутага старажытнага Івянца, што на Валожыншчыне, былі па-святочнаму ўзрушаны, а сам упрыгожаны горад нібы памаладзеў. Тут сустракалі майстроў і аматараў народнай творчасці з розных куткоў Беларусі, якія з'ехаліся на Мінскае абласное свята-конкурс «Гліняны звон».**

— Свята-конкурс майстроў ганчарства праходзіць на Міншчыне восьмы раз. Стартавала яно ў 1996 годзе ў Івянцы, а затым, так бы мовіць, качавала па іншых гарадах і мястэчках. І вось зноў вярнулася сюды — чацвёрты раз, — расказала **першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінскага аблвыканкама Святлана БАРАНОК.** — Гэта невыпадкова, менавіта тут вельмі моцныя традыцыі ганчарства, якія бяруць пачатак у XVI стагоддзі, а ўжо з канца XIX-га мястэчка лічыцца ганчарнай сталіцай. Тут выраблялі гліняныя посуд, цацкі, музычныя інструменты. Склаліся нават цэлыя сямейныя дынастыі ганчароў. І да цяперашняга часу ў горадзе вельмі развіты гэты напрамак. Менавіта ў Івянцы створаны і працуе музей традыцыйнай культуры, дзе ёсць розныя майстэрні, у тым ліку і ганчарная.

Першапачаткова свята не было такім маштабным. Удзел у ім прымалі каля 20 чалавек. Сёлетні «Гліняны звон» сабраў болей як 80 майстроў і іх вучняў не толькі з Міншчыны, але і з Магілёўскай, Брэсцкай, Гродзенскай, Віцебскай абласцей, са сталіцы.

Сяргей Рымдзёнак прыехаў з аграгарадка Германавічы Шаркаўшчынскага раёна, што на Віцебшчыне. У конкурсе ён удзельнічае ўпершыню.

— У мяне стаж ганчарства больш як 20 гадоў, але не ўсё яшчэ адкрыта. Такія мерапрыемствы шмат даюць у пазнавальным плане. Тут можна ўбачыць і пачарпнуць для сябе нешта новае, пагутарыць з калегамі, азнаёміцца з іх тэхналогіямі вырабу рэчаў. Ды і сваімі прафесійнымі сакрэтамі падзяліцца, — кажа Сяргей.

На стале майстра паліваныя гліняныя вырабы. Найбольш зацікавілі мяне ярка зялёныя яблыкі. Такіх больш на свяце не відаць.

— Гэта брэнд наша раёна. У вёсцы Алашкі жыў і працаваў беларускі Мічурын — заслужаны аграном БССР, вядомы садавод Сікора. Менавіта тут, на яго малой радзіме, які штогод у жніўні ладзіцца фэст «Светлы яблычны Спас — Сікоравай душы часцінка».





Міхаіл Насановіч з Любані — народны майстар Беларусі, працуе ў дзіцячай школе дэкаратыўнага прыкладнога мастацтва. У Міхаіла Аркадзевіча 17 вучняў. Сёння ён прывёз з сабой на свята самых таленавітых: Мікіту і Святлану.

— Трэба, каб маладыя сябе паказалі. А мы, старыя, ужо адбыліся як майстры, у кожнага свой стыль, тэхніка. Навошта нам спаборнічаць?

Побач з ім яшчэ адзін умелец — Віктар з Салігорска. Мужчына лепіць фігурку каровы.

— Я сам родам з вёскі. А для сельскіх жыхароў карова — гэта карміліца, якая дае і малако, і смятану, і тварог, і кефір. Вось дараблю хвост рагулі, высахне гліна, дык можа каму і згадзіцца, — кажа ён.

— Мы прыехалі з Салігорска цэлай камандай — ганчары, лепшчыкі з гліны, — уступае ў размову Алена Смоліч. — Я прадстаўляю дробную пластыку.

Алена паказвае нам цацку — леў з пілавіння: «Гэта сучасны варыянт».

З нашых краёў была мастачка Алена Кіш. Яна вельмі любіла маляваць гэтых цар-звяроў на сваіх дыванах. І мы туды ж, — тлумачыць майстрыха. — А наогул я займаюся керамікай з дзяцінства. Гэта маё хобі і крыху прафесія...

Тым часам свята гудзела і спявала. Хтосьці з гасцей спрабаваў выкруціць на ганчарным коле гаршчок, жбан або гладыш, зляпіць гліняную цацку. А нехта прыцэньваўся да ўнікальных ужо гатовых бытавых рэчаў для аздаблення сучаснага інтэр'ера кватэры, выбіраў сувеніры сваякам, сябрам. Весялілі шматлікіх гасцей і ўдзельнікаў вядомыя на Міншчыне калектывы народнай музыкі, фальклорныя гурты з Івянца і Валожына. А «Гліняны звон» традыцыйна напаўнялі гукі керамічных свісцёлак, званочкаў, акарын.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**ООО «Ист Вест инжиниринг»**

# ОБЪЯВЛЯЕТ ПЕРЕГОВОРЫ

**по выбору подрядчика на выполнение проектно-изыскательских работ по наружным сетям водопровода и газопровода на объекте «Строительство производственно-административного корпуса со вспомогательными помещениями для размещения кожгалантерейного производства СООО «Маттиоли». Наружные сети».**

Стартовая стоимость предмета закупки: 9 000 белорусских рублей.

Документацию для переговоров можно получить по адресу: **г. Минск, ул. Казинца, д. 11А, оф. 506А, тел./факс 8 (017) 322-02-29.**

Вскрытие предложений состоится **21.07.2016 в 14.00.**

УНП 191753078



# УРИЦКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ГОМЕЛЬСКОГО РАЙОНА

**7 сентября 2016 года в 15.00**

## проводит открытый аукцион по продаже земельного участка в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Инженерная инфраструктура | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по подготовке (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Гомельский район, Урицкий сельсовет, аг. Урицкое, ул. Полевая, (участок № 20 по генплану) | 321089602101000695 | 0,1500 га | Электроснабжение, водопровод, гравийно-щебеночная дорога, участок свободен от застройки | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 13 401 р. 91 к. (134 019 100) | 1340 р. 19 к. (13 401 910) | 840 р. 51 к. (8 405 158) + расходы на размещение информации в СМИ |

**Аукцион состоится по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 51А, малый зал заседаний Гомельского райисполкома 07.09.2016 в 15.00.**

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток в размере, порядке и срок, определенные в извещении.

**Документы, необходимые для участия в аукционе:**

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка.

2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (на расчетный счет с отметкой банка).

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1. Представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если не один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в частную собственность, при его согласии, с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5%).

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона или единственным участником аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протоколов о результатах аукциона.

*Задаток за участие в аукционе перечисляется на расчетный счет № 3641414230037 Урицкого сельского исполнительного комитета, филиала №302 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, ул. Барыкина, 94, МФО 151501664, УНП 400178472, код платежа 04901.*

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: Гомельский район, агрогородок Урицкое, ул. Ятченко Н.Г, 3. Урицкий сельский исполнительный комитет с даты опубликования извещения по **05 сентября 2016 года с 9.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00.**

Все желающие могут ознакомиться с документацией в Урицком сельском исполнительном комитете. Контактные телефоны: **(80232) 988-291, 988-293, +375291397339 (МТС).**


zepter bank

## Закрытое акционерное общество «Цептер Банк»

Адрес: 220034, г. Минск, ул. Платонова, 1Б
эл. адрес: info@zepterbank.by
Тел. 331 89 49, факс 331 89 48

# Сокращенная финансовая отчетность, подготовленная на основе аудированной финансовой отчетности за год, закончившийся 31 декабря 2015 года

### СОКРАЩЕННЫЙ ОТЧЕТ О ФИНАНСОВОМ ПОЛОЖЕНИИ ПО СОСТОЯНИЮ НА 31 ДЕКАБРЯ 2015 ГОДА

(в миллионах белорусских рублей)

| | 31 декабря 2015 года | 31 декабря 2014 года |
|---|---|---|
| **АКТИВЫ** | | |
| Денежные средства и их эквиваленты | 177,559 | 94,329 |
| Обязательные резервы в Национальном банке Республики Беларусь | 1,828 | 1,638 |
| Средства в других банках | 1,151 | 640 |
| Кредиты, предоставленные клиентам | 394,546 | 299,040 |
| Ценные бумаги, отражаемые по справедливой стоимости через прибыли или убытки | 127,930 | 142,870 |
| Ценные бумаги, имеющиеся в наличии для продажи | - | 35,280 |
| Производные финансовые инструменты, активы | - | 21,849 |
| Предоплата по текущему налогу на прибыль | 3,781 | - |
| Основные средства | 55,273 | 42,342 |
| Нематериальные активы | 4,046 | 2,856 |
| Прочие финансовые активы | 4,660 | 6,629 |
| Прочие активы | 24,247 | 2,662 |
| **ИТОГО АКТИВЫ** | **795,021** | **650,135** |
| **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | |
| Средства других банков | 3,990 | 948 |
| Средства клиентов | 315,293 | 192,549 |
| Выпущенные долговые ценные бумаги | 40,747 | 77,953 |
| Производные финансовые инструменты, обязательства | - | 29 |
| Обязательства по текущему налогу на прибыль | - | 1,471 |
| Прочие финансовые обязательства | 12,414 | 2,016 |
| Прочие обязательства | 231 | 75 |
| Субординированные займы | 138,622 | 68,597 |
| **ИТОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | **511,297** | **343,638** |
| **КАПИТАЛ** | | |
| Уставный капитал | 412,982 | 412,982 |
| Непокрытый убыток | (129,258) | (106,485) |
| **ИТОГО КАПИТАЛ** | **283,724** | **306,497** |
| **ИТОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И КАПИТАЛ** | **795,021** | **650,135** |

### СОКРАЩЕННЫЙ ОТЧЕТ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ ЗА ГОД, ЗАКОНЧИВШИЙСЯ 31 ДЕКАБРЯ 2015 ГОДА

(в миллионах белорусских рублей)

| | 2015 год | 2014 год |
|---|---|---|
| Процентные доходы | 74,668 | 79,631 |
| Процентные расходы | (39,720) | (38,550) |
| **Чистый процентный доход до убытков от обесценения по активам, по которым начисляются проценты** | **34,948** | **41,081** |
| Изменение резерва под обесценение по кредитам, предоставленным клиентам | (105,392) | (28,846) |
| **Чистый процентный доход после формирования резерва под обесценение по кредитам, предоставленным клиентам** | **(70,444)** | **12,235** |
| Доходы по услугам и комиссии полученные | 10,477 | 9,601 |
| Расходы по услугам и комиссии уплаченные | (1,863) | (1,647) |
| Чистый (убыток)/прибыль по операциям с ценными бумагами, отражаемыми по справедливой стоимости через прибыли или убытки | (584) | 173 |
| Чистая прибыль/(убыток) по ценным бумагам, имеющимся в наличии для продажи | 17 | (728) |
| Чистая прибыль по операциям с производными финансовыми инструментами | 5,971 | 5,130 |
| Курсовые разницы | 117,732 | 39,566 |
| Чистая прибыль от операций с иностранной валютой | 4,858 | 3,769 |
| Убыток по чистой денежной позиции | - | (43,304) |
| Административные и прочие операционные расходы | (60,790) | (51,918) |
| Прочие операционные доходы | 24,374 | 1,775 |
| Убыток от уценки имущества, полученного при обращении взыскания на залог и по договорам отступного | (1,125) | (438) |
| Корректировка по первоначальному признанию кредитов, предоставленных юридическим лицам | (824) | - |
| **Прибыль/(убыток) до налогообложения** | **27,799** | **(25,786)** |
| Расход по налогу на прибыль | (17,385) | (1,793) |
| **ПРИБЫЛЬ/(УБЫТОК) ЗА ГОД** | **10,414** | **(27,579)** |
| **Прочий совокупный доход Статьи, которые впоследствии могут быть реклассифицированы в прибыли или убытки:** | | |
| Инвестиции, имеющиеся в наличии для продажи | | |
| - Чистая прибыль за год | 17 | (728) |
| - Чистая прибыль, перенесенная в прибыль или убыток в результате выбытия | (17) | 728 |
| Налог на прибыль, отраженный напрямую в составе прочего совокупного дохода | - | - |
| Прочие совокупные расходы за год | - | - |
| **ИТОГО СОВОКУПНЫЙ ДОХОД/(УБЫТОК) ЗА ГОД** | **10,414** | **(27,579)** |

### СОКРАЩЕННЫЙ ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИЯХ В КАПИТАЛЕ ЗА ГОД, ЗАКОНЧИВШИЙСЯ 31 ДЕКАБРЯ 2015 ГОДА

(в миллионах белорусских рублей)

| | Уставный капитал | Непокрытый убыток | Итого капитал |
|---|---|---|---|
| **На 31 декабря 2013 года** | **412,982** | **(78,906)** | **334,076** |
| Убыток за год | - | (27,579) | (27,579) |
| Итого совокупный убыток за год | - | (27,579) | (27,579) |
| **На 31 декабря 2014 года** | **412,982** | **(106,485)** | **306,497** |
| Прибыль за год | - | 10,414 | 10,414 |
| Итого совокупный доход за год | - | 10,414 | 10,414 |
| Дивиденды выплаченные | | (33,187) | (33,187) |
| **На 31 декабря 2015 года** | **412,982** | **(129,258)** | **283,724** |

### СОКРАЩЕННЫЙ ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ЗА ГОД, ЗАКОНЧИВШИЙСЯ 31 ДЕКАБРЯ 2015 ГОДА

(в миллионах белорусских рублей)

| | 2015 год | 2014 год |
|---|---|---|
| **Движение денежных средств от операционной деятельности** | | |
| Проценты полученные | 84,082 | 78,649 |
| Проценты уплаченные | (43,343) | (35,240) |
| Доходы по услугам и комиссии полученные | 10,527 | 9,619 |
| Расходы по услугам и комиссии уплаченные | (1,863) | (1,647) |
| Чистая прибыль по операциям с ценными бумагами, отражаемыми по справедливой стоимости через прибыли или убытки | (584) | 173 |
| Чистый доход, полученный по операциям с производными финансовыми инструментами | 5,971 | 36 |
| Чистый доход, полученный по операциям с иностранной валютой | 4,858 | 3,769 |
| Доход, полученный по погашению ранее списанных кредитов | 5,319 | 1 |
| Прочие операционные доходы полученные | 3,888 | 172 |
| Расходы на персонал уплаченные | (27,159) | (24,665) |
| Административные и прочие операционные расходы уплаченные | (28,443) | (23,127) |
| Налог на прибыль уплаченный | (22,681) | (3,347) |
| **Движение денежных средств от операционной деятельности до изменения операционных активов и обязательств** | **(9,428)** | **4,393** |
| *Чистый (прирост)/снижение по:* | | |
| - обязательным резервам в Национальном банке Республики Беларусь | (190) | (419) |
| - ценным бумагам, отражаемым по справедливой стоимости через прибыли или убытки | 83,492 | (67,642) |
| - средствам в других банках | 138 | 1,217 |
| - кредитам, предоставленным клиентам | (87,070) | 109,781 |
| - производным финансовым активам | 21,849 | - |
| - прочим финансовым инструментам, активам | 3,888 | 33 |
| - прочим активам | (7,476) | (1,925) |
| *Чистый прирост/(снижение) по:* | | |
| - средствам других банков | 105 | (47,659) |
| - средствам клиентов | 60,201 | 10,567 |
| - выпущенным долговым ценным бумагам | (34,557) | 58,033 |
| - прочим финансовым инструментам, обязательствам | (2,231) | (358) |
| - прочим обязательствам | (165) | 608 |
| **Чистое движение денежных средств от операционной деятельности** | **28,556** | **66,629** |
| **Движение денежных средств от инвестиционной деятельности** | | |
| Приобретение ценных бумаг, имеющихся в наличии для продажи | - | (74,503) |
| Поступления от продажи и погашения ценных бумаг, имеющихся в наличии для продажи | 45,171 | 42,867 |
| Приобретение основных средств и нематериальных активов | (8,669) | (16,553) |
| Выбытие основных средств | 154 | 475 |
| **Чистые денежные средства, полученные/(использованные) в инвестиционной деятельности** | **36,656** | **(47,714)** |
| **Движение денежных средств от финансовой деятельности** | | |
| Поступления от субординированного займа | 31,742 | 8,931 |
| Дивиденды выплаченные | (33,187) | - |
| **Чистое движение денежных средств от финансовой деятельности** | **(1,445)** | **8,931** |
| Влияние изменений обменного курса на денежные средства и их эквиваленты | 19,463 | 5,274 |
| Влияние инфляции на денежные средства и их эквиваленты | - | (10,800) |
| **Чистое увеличение денежных средств и их эквивалентов** | **83,230** | **22,321** |
| Денежные средства и их эквиваленты на начало года | 94,329 | 72,009 |
| **Денежные средства и их эквиваленты на конец года** | **177,559** | **94,329** |

В течение годовых периодов, закончившихся 31 декабря 2015 года и 31 декабря 2014 года, Банк произвел неденежные расчеты по кредитам, предоставленным клиентам в предыдущие периоды, взыскание которых было признано безнадежным. Указанные неденежные расчеты исключены из отчета о движении денежных средств и представлены отдельно следующим образом:

| | 2015 год | 2014 год |
|---|---|---|
| Кредиты, предоставленные клиентам, которые были погашены посредством обращения взыскания на обеспечение | 6,877 | 6,658 |
| Прочий доход, полученный посредством обращения взыскания на обеспечение кредитов, списанных ранее | 16,372 | 1,775 |
| Имущество, полученное в качестве обеспечения | 23,249 | 8,433 |

**От имени Правления Банка:**

**М.И. Проворов**
**Председатель Правления**

21 апреля 2016 года
Минск

**О.В. Михалевич**
**Главный бухгалтер**

21 апреля 2016 года
Минск

**Данная отчетность размещена на сайте www.zepterbank.by на странице https://www.zepterbank.by/bank/about/report/**

Лицензия Национального банка Республики Беларусь №31 от 28.05.2013 года на осуществление банковской деятельности. УНП 807000214

Deloitte.


Иностранное унитарное предприятие «Делойт и Туш»
ул. К. Цеткин, д. 51А, 13 этаж
Минск, 220004
Республика Беларусь

Тел. +375 (17) 309 99 00
Факс: +375 (17) 309 99 01
www.deloitte.by


### ОТЧЕТ НЕЗАВИСИМОГО АУДИТОРА ПО СОКРАЩЕННОЙ ФИНАНСОВОЙ ОТЧЕТНОСТИ

Акционерам Закрытого акционерного общества «Цептер Банк»

Прилагаемая публикуемая сокращенная финансовая отчетность, состоящая из публикуемого сокращенного отчета о финансовом положении по состоянию на 31 декабря 2015 года и публикуемых сокращенных отчетов о совокупном доходе, об изменениях в капитале, о движении денежных средств за год, закончившийся 31 декабря 2015 года, составлена на основе аудированной финансовой отчетности ЗАО «Цептер Банк», подготовленной в соответствии с требованиями Международных стандартов финансовой отчетности, за год, закончившийся 31 декабря 2015 года. Мы выразили безусловно положительное мнение по финансовой отчетности ЗАО «Цептер Банк» в аудиторском заключении от 21 апреля 2016 года. Аудированная финансовая отчетность и публикуемая сокращенная финансовая отчетность не отражают влияния событий, произошедших после даты аудиторского заключения.

В данной публикуемой сокращенной финансовой отчетности не раскрывается вся информация, требуемая Международными стандартами финансовой отчетности. Поэтому ознакомление с публикуемой сокращенной финансовой отчетностью не заменяет ознакомления с аудированной финансовой отчетностью ЗАО «Цептер Банк».

*Ответственность руководства за подготовку сокращенной финансовой отчетности*

Руководство Банка несет ответственность за подготовку публикуемой сокращенной финансовой отчетности на основе аудированной финансовой отчетности в соответствии с требованиями Инструкции о раскрытии информации о деятельности банка, небанковской кредитно-финансовой организации, банковской группы и банковского холдинга, утвержденной Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь № 19 от 11 января 2013 года.

*Ответственность аудитора*

Наша ответственность заключается в выражении мнения о данной публикуемой сокращенной финансовой отчетности на основе процедур, проведенных в соответствии с Международным стандартом аудита (МСА) 810 «Аудиторские задания по сокращенной финансовой отчетности».

*Мнение*

По нашему мнению, прилагаемая публикуемая сокращенная финансовая отчетность, составленная на основе аудированной финансовой отчетности ЗАО «Цептер Банк» за год, закончившийся 31 декабря 2015 года, соответствует этой финансовой отчетности во всех существенных аспектах.

В целях более точного понимания финансового положения ЗАО «БТА Банк» по состоянию на 31 декабря 2015 года и результатов его деятельности за год, закончившийся на эту дату, публикуемую сокращенную финансовую отчетность следует изучать вместе с аудированной финансовой отчетностью, которая была размещена в полном объеме на сайте Банка www.zepterbank.by.

Deloitte & Touche

21 апреля 2016 года
Минск

Генеральный директор Иностранного унитарного аудиторского предприятия «Делойт и Туш»

А.П. Сурмач
Квалификационный аттестат аудитора № 0001231 от 21 апреля 2005 года, выданный Министерством финансов Республики Беларусь. Свидетельство № 45 о соответствии квалификационным требованиям для осуществления аудиторской деятельности в банковской системе от 24 декабря 2008 года

Аудитор Иностранного унитарного аудиторского предприятия «Делойт и Туш»

М.А. Шаченкова
Квалификационный аттестат аудитора № 0002335 от 23 декабря 2015 года, выданный Министерством финансов Республики Беларусь. Свидетельство № 94 о соответствии квалификационным требованиям для осуществления аудиторской деятельности в банковской системе от 21 января 2016 года

■ По новай традыцыі

# ВІНО НАПАЛОВУ З ВАДОЙ

## Ці пераможам злоўжыванне?

**Новая дзяржаўная праграма «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека» на 2016—2020 гады прадугледжвае 53 мерапрыемствы, накіраваныя на прафілактыку ўжывання алкаголю. Тут і заканадаўчыя ініцыятывы, і асветніцкі падыход, і абмежаванне даступнасці алкагольных напояў. Плануецца, у прыватнасці, абмежаваць рэалізацыю алкаголю і тытуню ў парках, падалей перанесці такі продаж ад устаноў аховы здароўя, адукацыі, спорту і культуры. Іншыя падрабязнасці тлумачыць галоўны нарколаг Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Іван КАНАРАЗАЎ.**

### Сіндром залежнасці

— У апошнія пяць гадоў колькасць людзей, якія пакутуюць ад хранічнага алкагалізму, пакрысе зніжаецца. Сёння на дыспансерным уліку ўжо не 190 тысяч, а 160 тысяч хранічна хворых, або з сіндромам залежнасці ад алкаголю. Яны атрымліваюць спецыялізаваную меддапамогу як у стацыянарах, так і амбулаторна. Фактычна не мяняецца колькасць тых, хто назіраецца ў псіхіятра-нарколага па прычыне знаходжання на прафілактычным уліку — 85 тысяч. Гэта тыя, у каго сіндром яшчэ не сфарміраваўся, але рызыка вялікая. Трэба заўважыць, што крытэрыі пастаноўкі дыягназу «сіндром залежнасці ад алкаголю» прапісаны ў міжнароднай класіфікацыі захворванняў, якой мы і кіруемся.

### Зняць з уліку

— Навуковыя назіранні за хворымі з сіндромам залежнасці ад алкаголю дазваляюць выявіць асаблівасці біяхімічных рэакцый абмену нейрамедыятараў у галаўным мозгу. Пры адсутнасці ўжывання псіхаактыўных рэчываў або алкаголю нейрамедыятары могуць аднаўляцца. А таму, калі чалавек на дыспансерным назіранні вытрымлівае ўсе тэрміны яўкі, калі псіхіятр-нарколаг можа сказаць, што пацыент устрымліваецца ад ужывання, праходзіць прызначаны курс лячэння, пагаджаецца на лячэнне ў аддзяленні дзённага знаходжання, прайшоў 28-дзённы курс медыцынскай рэабілітацыі, то праз тры гады ўрачэбная камісія можа прааналізаваць сітуацыю і вызначыцца з тым, ці можна гаварыць пра наступленне рэмісіі. Без практыкі зняцця з уліку цяжка ўявіць, як бы мы ахапілі ўсіх пацыентаў якаснай меддапамогай.

### Група рызыкі

— Хворыя, як правіла, цалкам адмаўляюць наяўнасць захворвання. Аднак выявіць хранічна хворых не так і цяжка, дакладней, ім цяжка хаваць бясконца — выдаюць парушэнні працоўнай дысцыпліны, дарожна-транспартныя здарэнні, асацыяльныя паводзіны, бытавыя канфлікты, іншыя хранічныя захворванні. А таму лічба тых, хто стаіць на дыспансерным уліку, у большай ступені адпавядае рэальнай сітуацыі. Ціхіх бытавых п'яніц, якія спяць дома і не выклікаюць ніякіх праблем, вельмі мала. А вось групу прафілактычнага назірання за шкодным ужываннем можна смела памнажаць на 2-3. У нашым грамадстве ўсё яшчэ не ўсведамляецца, што ўжыванне вялікіх доз алкаголю 3-4 разы на месяц — гэта вялікая праблема і група рызыкі!

### Меры для работнікаў

— Траўматызм на вытворчасці ў стане алкагольнага ап'янення знізіўся за апошнія гады. Гэта стала магчымым дзякуючы прыняццю ў 2013 годзе пастановы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны і Міністэрства аховы здароўя. Паводле дакумента, перад працоўнай зменай, а таксама перыядычна падчас работы на прадпрыемствах могуць праводзіцца як медагляды, так і прыборны нагляд даверанай асобай наймальніка. Калі, напрыклад, ёсць падазрэнне, што чалавек нападпітку, праводзіцца прыборны кантроль, і пры выяўленні пароў этанолу ў паветры, якое выдыхае работнік, ён адхіляецца ад работы.

Міністэрствам аховы здароўя ў 2014 годзе былі распрацаваны метадычныя рэкамендацыі для наймальнікаў па выяўленні ў працоўных калектывах работнікаў, схільных да ўжывання алкаголю і псіхаактыўных рэчываў — своеасаблівая інструкцыя па выяўленні такіх людзей, далейшай тактыцы работы з імі, накіравання на прыём да спецыялістаў, а таксама па правядзенні ў калектыве прафілактычнай работы.

### На душу насельніцтва

— У 2014-м Сусветная арганізацыя аховы здароўя палічыла Беларусь самай пітушчай краінай. Мы тады абгрунтавана падышлі да абвяржэння такога погляду. СААЗ прыняла нашы довады, і сёння Беларусь знаходзіцца на іншых пазіцыях. Пра гэта сведчаць і зніжэнне выяўленых фактаў алкагольных псіхозаў, зніжэнне вытворчага траўматызму і дарожна-транспартных здарэнняў, учыненых у стане алкагольнага ап'янення. Афіцыйны ўзровень продажу алкаголю за мінулы год склаў 9,05 л на душу насельніцтва. Лічба больш аптымістычная, але ўсё роўна трывожная — мы павінны ўлічваць яшчэ знешнія рызыкі, скажам, усплёск нелегальна завезенага алкаголю, што назіралася сёлета. Чым меншы ўзровень спажывання будзе, тым лепш. Зніжэнне ўзроўню спажывання алкаголю на 1 л на душу насельніцтва дазволіць папярэдзіць каля 30 працэнтаў захворванняў страўнікава-кішачнага тракта, туберкулёзу — на 15-20 працэнтаў, кардыяміяпатый — на 26-83.

### Згубная мадэль

— Паводле падпраграмы «Папярэджванне і пераадоленне п'янства і алкагалізму» мы павінны дасягнуць дзвюх асноўных мэт: зніжэння шкоднага ўжывання алкаголю насельніцтвам і зніжэння сацыяльна-эканамічных наступстваў шкоднага ўжывання алкаголю. У нашай краіне пераважае так званая паўночная, скандынаўская мадэль, калі вялікая колькасць алкаголю ўжываецца за кароткі прамежак часу. Насельніцтву трэба тлумачыць, што гэта недапушчальна. Алкагалізм і п'янства — зло, і яно шкодзіць не толькі самому алкаголіку ці п'яніцы. А шкода для яго відавочная — гэта ўзнікненне такіх цяжкіх хранічных захворванняў, як кардыяміяпатыя, гепатыт, цыроз, палінейрапатыя, што прыводзіць да інваліднасці і заўчаснай гібелі. Аднак пакуль чалавек жыве і працуе, то паспявае нанесці вялікую шкоду і навакольным — мінімум пяці-сямі людзям з блізкага акружэння.

### Рука дапамогі

— Наркалагічная служба досыць шырока прадстаўлена па ўсёй краіне: ёсць цэнтры, дыспансеры гарадскога і абласнога ўзроўняў, РНПЦ псіхічнага здароўя. Развіваецца медыцынская рэабілітацыя. Усе рэгіёны павінны адкрыць на ўзроўні абласных цэнтраў стацыянарныя рэабілітацыйныя аддзяленні, дзе будуць рэалізоўвацца навукова даказаныя рэабілітацыйныя праграмы. У большасці рэгіёнаў яны ўжо ёсць, але ўдасканаленню няма межаў. Для атрымання такой дапамогі пацыент павінен мець вялікае жаданне яе атрымаць. Бо працэс гэта працяглы — каля месяца залежны знаходзіцца ў медустанове. Вынікі звычайна досыць добрыя, але не ўсё залежыць ад урачоў. Дасягненне стойкай рэмісіі, устрымання толькі на 30 працэнтаў абумоўлена намаганнямі ўрача, астатняе — гэта ўклад сям'і, працоўнага калектыву. Псіхіятр-нарколаг у любым выпадку не можа знаходзіцца побач з залежным кругласутачна і да канца жыцця. Згубную звычку неабходна замясціць нейкімі іншымі заняткамі. Як бы мы ні змагаліся за кожнага, многія, на жаль, не бачаць працягнутую ім руку і ўсё ж такі падаюць у бездань.

У дачыненні да непаўналетніх мы павінны весці размову не пра рэабілітацыю, што літаральна азначае аднаўленне страчаных функцый і навыкаў, а пра абелітацыю. Гэта новы напрамак у свеце, які мае на ўвазе навучанне дзіцяці чамусьці новаму, пераключэнне яго ўвагі на іншыя заняткі. Але гэтым будзе займацца ўжо не ўрач.

### Забараніць немагчыма

— Наркалагічная служба сёння, як і ахова здароўя у цэлым, накіравана на прафілактыку захворванняў. Кожны павінен навучыцца здарова му ладу жыцця і жыць адпаведным чынам. Розныя кароткатэрміновыя абмежаванні і забароны, якія мы практыкавалі да гэтага, даюць кароткатэрміновы эфект. Нам жа неабходны комплекс мер і цвёрдае ўсведамленне таго, што вялікую колькасць алкаголю ўжываць проста нельга! А цалкам забараніць алкаголь мы не зможам. У нас ён быў здаўна, мы ніколі не належалі да краін з такой забаронай. Наша задача — звярнуць увагу на разумнае стаўленне да алкаголю, што прапануе так званая міжземнаморская дыета. Тыя ж італьянцы выпіваюць за вечар келіх белага віна, разбаўленага напалову вадой. Вось якім можа быць спажыванне алкаголю. А што мы бачым сёння? Апытанні падлеткаў паказваюць, што кожнаму другому алкаголь налівалі ў сям'і. Па прынцыпе, дасягнуў нейкага ўзросту — ну давай, пакаштуй шампанскага. А гэтага рабіць ні ў якім разе нельга! Бацькі проста паказваюць такім чынам, што гэта абсалютная норма — ужываць алкаголь. Лепей бы яны паказалі, што можна катацца на каньках і плаваць у басейне.

### Практычна атрута

— Алкаголь парушае ўсе функцыі — зніжае крытычнасць, увагу, каардынацыю, запавольвае рэакцыі. Розныя змяненні псіхафізічнага стану будуць тлумачыцца колькасцю ўжытага алкаголю. Калі выпіць вельмі шмат, то ўзнікае санлівасць, калі яшчэ больш — то алкагольная кома і гібель.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*




■ У тэму

## Вырашылі пракаціцца на аўто кліента

**Супрацоўнікі аддзела дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі Партызанскага РУУС сталіцы ноччу затрымалі кіроўцу, які, будучы нападпітку, угнаў аўтамабіль з аўтамыйкі.**

— Напярэдадні ўвечары два 20-гадовыя хлопцы, якія працавалі на аўтамыйцы па завулку Казлова, вырашылі адпачыць пад алкаголь, а пасля — пракаціцца на адной з машын. Выбар спыніўся на «Рэно», якое кліент прыгнаў для хімчысткі і пакінуў на два дні, — расказала прэс-афіцэр Партызанскага РУУС г. Мінска Наталля Ганусевіч. — Накіроўваючыся ў бок плошчы Бангалор, кіроўца прыцягнуў увагу свайй яздой: «падразаў» аўтамабілі, што ехалі побач, рэзка тармазіў і бясконца перастройваўся з паласы на паласу. Заўважыўшы гэта, кіроўца таксі патэлефанаваў у міліцыю. Праз некалькі хвілін гора-аўтамабілісты былі затрыманы. Кіроўца раней быў судзімы за кіраванне транспартным сродкам нападпітку. Цяпер яму пагражае пазбаўленне волі тэрмінам да пяці гадоў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## Тайнік з гарэлкай

**У Бабруйску канфіскавана адна з самых буйных сёлета ў Беларусі партыя нелегальнай алкагольнай прадукцыі.**

Праваахоўнікамі затрыманы два мясцовыя жыхары (беспрацоўны і індывідуальны прадпрымальнік), якія мелі дачыненне да распаўсюджвання нелегальнай гарэлкі і спірту. У беспрацоўнага ў мікрааўтобусе было знойдзена 846,5 літра гарэлкі «Колас» — 1693 паўлітровыя бутэлькі з акцызнымі маркамі Расійскай Федэрацыі. А ў двары дома прадпрымальніка выяўлены цэлы склад алкагольнай прадукцыі... пад зямлёй.

— Схаванае на глыбіню больш за 2 метры памяшканне было даверху запоўнена скрынкамі з гарэлкай і спіртам, — паведаміў **начальнік першага аддзела УБЭЗ УУС Магілёўскага аблвыканкама падпалкоўнік міліцыі Андрэй ХАРКЕВІЧ.** — Усяго тут знойдзена і канфіскавана 10 590 літраў спіртазмяшчальнай вадкасці (7480 літраў спірту ў пяцілітровых пластыкавых ёмістасцях і 3 110 літраў гарэлкі «Колас»). Уся прадукцыя з акцызнымі маркамі Расійскай Федэрацыі ацэньваецца ў суму каля 2 мільярдаў недзнамінаваных беларускіх рублёў.

Па факце праводзіцца праверка. Назначана судовая экспертыза спіртавой вадкасці, якой займаецца абласное ўпраўленне Дзяржкамітэта судовых экспертыз РБ. Кіроўца мікрааўтобуса і індывідуальны прадпрымальнік ужо траплялі ў поле зроку праваахоўных органаў. У залежнасці ад вынікаў праверкі, якая цяпер праводзіцца УБЭЗ УУС, будзе ўстаноўлена ступень віны кожнага з іх і вынесена пакаранне.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Выязная прыёмная

# УМОВЫ КАРЫСТАННЯ СЯМЕЙНЫМ КАПІТАЛАМ НЕ ЗМЕНЯЦЦА,

## а заробкі бюджэтнікам неўзабаве будуць налічваць па-іншаму

**Акцыя «Дзень з Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны» праводзіцца з 2012 года. За гэты час прававую дапамогу ў рамках мерапрыемства атрымалі больш за тысячу грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб. Днямі спецыялісты ведамства наведалі Слуцк. «Звязда» далучылася да «выязной прыёмнай» міністэрства і сабрала адказы на самыя актуальныя пытанні.**

### Трацiць капітал толькі праз 18 гадоў

На сустрэчы ў райвыканкаме случане дзяліліся надзённым. Старшыню раённага аб'яднання прафсаюзаў Алу Русак хвалявала, ці ўдалося нарэшце спыніць апераджальны рост заробкаў над прадукцыйнасцю працы.

**Выпускнікі школ сёння не хочуць паступаць у каледжы, бо атрымаць прафесію могуць за пару месяцаў на курсах пры цэнтрах занятасці.**

— На жаль, да 2014 года суадносіны павелічэння прадукцыйнасці і ўзроўню аплаты працы складалі 0,98. Грошы зарабляліся, але дзейнасць прадпрыемстваў пры гэтым не была эфектыўнай. Пасля прыняцця пастановы №744 на 2015 год мы ўжо атрымалі каэфіцыент 1,03. І ў сёлетнім паўгоддзі ў нас станоўчая дынаміка — каэфіцыент 1,08. Можа, яшчэ і раней трэба было прымаць такую пастанову, бо эфект ёсць, і мы ў лічбах гэта бачым, — пракаментаваў **першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Андрэй ЛАБОВІЧ.**

Кіраўнік аддзела ЖКГ Слуцкага райвыканкама Людміла Папчэня хацела даведацца, ці будуць зменены ўмовы карыстання мацярынскім капіталам. «Сёлета ў Слуцку будуецца шматкватэрны жылы дом па дзяржаўным заказе. Як правіла, кожная шматдзетная сям'я, якой мы прапануем пакупку кватэры, цікавіцца магчымасцю разлічыцца за кошт сямейнага капіталу», — тлумачыць актуальнасць гэтага пытання спецыяліст.

— Шчыра скажу, што змена тэрмінаў выкарыстання сямейнага капіталу на паляпшэнне жыллёвых умоў шматдзетных сем'яў не разглядаецца. Капітал увялі, каб бацькі маглі ў будучыні патраціць грошы на дзяцей, напрыклад на іх адукацыю, а не цяпер на саміх сябе. Таму мы не бачым неабходнасці павялічваць пералік кірункаў, на якія можна выкарыстоўваць гэтыя сродкі датэрмінова, — лічыць першы намеснік міністра.

### Усё ў руках наймальніка

Размова ішла і пра аплату працы ў бюджэтным сектары. Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця на наступнае пяцігоддзе прадугледжвае ўтрымліваць заробкі работнікаў дзяржустаноў не ніжэйшымі за 80 працэнтаў да сярэдняга заробку па краіне. Ці ўдасца выканаць гэты паказчык?

— Сёлета ў нас суадносіны — амаль 79 працэнтаў. І з года ў год плануем павышаць планку. На 2017-ты, напрыклад, атрымаць 82 працэнты, а да 2020 года давесці да 88 працэнтаў, — акрэсліў перспектыву Андрэй Лабовіч.

Пры гэтым, адзначыў першы намеснік міністра, педагогі атрымліваюць больш, чым асноўная частка бюджэтнікаў. Заробкі выкладчыкаў складаюць каля 90 працэнтаў да сярэдняга заробку па краіне. Гэтай катэгорыі, як і медыкам, апошнім часам надавалася дастаткова шмат увагі. Устаноўлены розныя даплаты і надбаўкі, каб падняць прэстыж прафесій настаўніка і ўрача.

Цяпер міністэрства рыхтуе рэформу аплаты працы ў бюджэтным сектары. Праект указа ўжо разасланы іншым рэспубліканскім органам на ўзгадненне. «Калі ёсць стаўка першага разраду, каэфіцыенты, аклад, а да яго яшчэ 5-10 стымулюючых і кампенсавальных выплат, то ў кіраўніка галава кругам ідзе. Часам маладым спецыялістам, якія прыходзяць на месцы бухгалтараў, патрэбна паўгода, каб зразумець, каму, за што і колькі налічыць», — тлумачаць неабходнасць змен у міністэрстве.

Па-першае, рэформа будзе мець на ўвазе спрашчэнне парадку разліку заработнай платы. Па-другое, дасць большую магчымасць кіраўнікам самім вызначаць памеры стымулюючых і кампенсавальных выплат персаналу. Так, будзе нейкая тарыфная частка, якую работнік атрымае ў любым выпадку, але за кошт дадатковых выплат наймальнік сам адзначыць рублём тых, хто працуе лепш.

**Змена тэрмінаў выкарыстання сямейнага капіталу на паляпшэнне жыллёвых умоў шматдзетных сем'яў не разглядаецца. Капітал увялі, каб бацькі маглі ў будучыні патраціць грошы на дзяцей, напрыклад на іх адукацыю, а не цяпер на саміх сябе.**

— Вы павінны разумець, што ніякага зніжэння заробку пры ўкараненні гэтай сістэмы не адбудзецца. Мы ўсё пралічваем, — запэўніў Андрэй Лабовіч.

### Службы занятасці каледжам не канкурэнты

Праблемы ўзгаднення рынку працы і рынку адукацыйных паслуг спецыялісты міністэрства абмяркавалі разам з кіраўнікамі навучальных устаноў Случчыны. У ведамстве разумеюць: той дзяржаўны заказ, які ёсць сёння, сваё функцыі не выконвае. Трэба яго перагледзець.

— Як гэта вырашаецца ў Заходняй Еўропе? Пастаянна апытваюцца наймальнікі: што будзе ў іх у наступным годзе, праз пяць гадоў. Мы спрабавалі даведацца пра план развіцця на нашых прадпрыемствах, але яны даволі закрытыя. Беларускія наймальнікі не дзеляцца інфармацыяй, кажучы, гэта камерцыйная тайна, — заўважаюць у міністэрстве.

А пакуль ведамства праводзіць двойчы на год маніторынг попыту і прапановы на рынку. Гэтыя звесткі выкарыстоўваюцца ў тым ліку і для таго, каб скарэктаваць набор у адукацыйныя ўстановы.

Дырэктар Слуцкага дзяржаўнага сельскагаспадарчага прафесійнага ліцэя Сяргей Шыловіч акрэслівае яшчэ адну праблему: выпускнікі школ сёння не хочуць паступаць у каледжы, бо атрымаць прафесію могуць за пару месяцаў на курсах пры цэнтрах занятасці. Тым больш адпрацоўкі па размеркаванні пасля іх няма. Пры гэтым не запоўнены бюджэтныя месцы ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах.

У міністэрстве тлумачаць: іх задача — дапамагчы беспрацоўнаму знайсці работу, няважна, выпускнік ён ці не. Але службы занятасці не спрабуюць быць канкурэнтамі сістэме адукацыі. Падлеткаў да апошняга арыентуюць ісці па дыплом у каледж ці ВНУ.

Ёсць складанасці і з уладкаваннем выпускнікоў з інваліднасцю. «Яны хочуць працаваць, хочуць вучыцца. Але гэтых дзяцей не гатовы браць на работу, хоць у іх ёсць спецыяльнасць: мы рыхтуем будаўнікоў, агароднікаў. Так мы прыйдзем да таго, што ўсе навучальныя ўстановы адмовяцца ад набору такіх дзяцей, бо іх немагчыма ўладкаваць», — дзеліцца набалелым Сяргей Шыловіч.

— Тут ёсць праблема, — згодны спецыялісты ведамства. — Цяпер разглядаецца пытанне аб тым, каб студэнтам з інваліднасцю браніраваць працоўныя месцы. Да 2006 года, дарэчы, так і было. Хутчэй за ўсё, мы вернемся да гэтай сістэмы; магчыма, у наступным годзе.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

*Мінск — Слуцк — Мінск*

# РЭКОРДНАЯ ПРЫГАЖОСЦЬ



Фота Надзеі БУЖАН.

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Сакрэтнасць парушылася летась. Пасля адной з камандзіровак у вёску раёна прычоска жанчыны трохі растрапалася, і яна вырашыла паправіць яе проста ў працоўным кабінеце. Сказаць, што калегі былі шакаваныя — не сказаць нічога. Валасы Таццяны разглядалі, як сапраўдны экспанат.

— Якраз дзяўчаты цяпер і займаюцца «піярам» маёй касы, — смяецца жанчына. — Гэта яны званілі вам у рэдакцыю, а яшчэ раней расказалі пра мяне журналістам нашых мясцовых газет. Праўда, першым часам нават трохі крыўдавалі, маўляў, «чаму не расказала раней?» Але я ніколі не лічыла гэта нечым асаблівым. Неяк нават прыходзіла ў цырульню, хацела зрабіць кароткую прычоску, але ніхто не ўзяўся. Баяліся, што прыбяжыць муж і будзе сварыцца. Дарэчы, сапраўды, аднойчы быў выпадак, калі я трохі ўкараціла валасы. І сужэнец сказаў: «Я цябе, канешне, не за прычоску кахаю, але наступным разам пакрыўджуся». Сыну таксама падабаецца, ён кажа, што хоча жонку з доўгай касой.

Летась сяброўкі Таццяны вырашылі праславіць яе прычоску на ўвесь свет — пазванілі ў рэдкалегію Кнігі рэкордаў краін СНД і Балтыі. Патрэбна была заяўка на даўжыню 160 сантыметраў, але якраз за тыдзень да званка жанчына падрэзала валасы і ўкараціла іх да 152-х. Магчыма, новую спробу жанчыны зробяць ужо сёлета. Праўда, на сусветны рэкорд спадзявацца пакуль не прыходзіцца — у кітаянкі Ксі Квіпінг валасы дасягаюць амаль шасціметровай даўжыні.

Таццяна прызнаецца, што галоўнай яе праблемай заўсёды былі цырульнікі — усе баяцца брацца за такую каштоўнасць. Рашэнне жанчына знайшла простае — стала сама сабе майстрам: навучылася стрыгчы і рабіць прычоскі. Праблем хапае, варта толькі сказаць, што пасля мыцця сушыць такую касу прыходзіцца не менш за тры гадзіны. З распушчанымі валасамі жанчына ніколі не ходзіць. Ды гэта і не было б зручна пры росце 168 сантыметраў. Адзіныя, хто можа ўбачыць іх «як ёсць» — муж і сын. Усё вырашаюць практыкаванні — цяпер нават на складанне прычоскі Таццяна траціць каля 10 хвілін.

— Раней, калі валасы былі гусцейшымі, нават не магла знайсці для іх заколку — савецкія не вытрымлівалі напружання і «адстрэльвалі», — усміхаецца жанчына. — Увесь час хадзіла з «гулькай», а яна ж цяжкая. Хлопцы з-за гэтага сарамеліся са мной знаёміцца. Маўляў, надта ганарлівая дзяўчына, увесь час задраўшы нос ходзіць.

Даглядаць жа самі валасы, па словах гаспадыні, не так цяжка. Усё вельмі аскетычна — звычайны шампунь, нават без кандыцыянераў і бальзамаў. Афарбоўка — толькі пры дапамозе хны. Адзінае, што можа сабе дазволіць Таццяна — апалосканне натуральнымі сродкамі, напрыклад, рамонкам.

Здараліся з рэкорднай касой і вясёлыя гісторыі. Аднойчы падчас візіту ў Мінск, калі валасы яшчэ былі карацейшымі і Таццяна магла насіць звычайныя прычоскі, у метро яе заўважыў мужчына. Сваё захапленне даўжынёй касы ён выразіў з дзіцячай непасрэднасцю: «Вой, якія мы валасатыя!» «Я не пакрыўдзілася, — смяецца Таццяна. — Проста чалавеку, відаць, шчыра спадабалася».

— Дзяўчаты часта пытаюцца: «Чаму не прадасі валасы? Гэта ж, пэўна, столькі грошай будзе каштаваць!» Але мне гэта нецікава. Магчыма, я проста той чалавек, які любіць пастаянства, калі мяне ўсё задавальняе, навошта штосьці змяняць?

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

*Мінск — Слуцк — Мінск*

■ Факт

### Хто на сядзібе гаспадыня?

**Гродзенская абласная арганізацыя грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын» запрасіла ўсіх ахвотных да ўдзелу ў конкурсе «Гаспадыня сядзібы — гаспадыня краіны».**

Гэтаму ўнікальнаму праекту сёлета спаўняецца 10 гадоў. У ім удзельнічаюць жыхаркі і сельскіх населеных пунктаў, і гарадоў, якія клапоцяцца аб добраўпарадкаванні сваіх сядзіб, двароў, вуліц. Адпаведныя і конкурсныя намінацыі: «Найлепшая гаспадыня двара», «Найлепшая гаспадыня аграсядзібы», «Найлепшыя двары» (шматпавярховікі ў гарадах і пасёлках), «Найлепшая вуліца на вёсцы», «Найлепшая кветкавая кампазіцыя «Герб майго горада/раёна». Акрамя таго, гаспадыні паспаборнічаюць у намінацыі «Найлепшы кулінарны шэдэўр «Каравай-2016». Конкурс праводзіцца ў два туры: спачатку ў раёнах, а затым на абласным узроўні з удзелам пераможцаў раённых этапаў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

### Гасцяваць і працаваць трэба па правілах

**За час правядзення спецыяльных комплексных мерапрыемстваў «Нелегал» супрацоўнікі міліцыі прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасці больш за дзве тысячы іншаземцаў, якія парушылі правілы знаходжання ў Беларусі, а таксама парадак ажыццяўлення працоўнай дзейнасці.**

У прыватнасці, адпрацоўваліся месцы кампактнага знаходжання замежных грамадзян — рынкі, вакзалы, інтэрнаты, здымныя кватэры. Апроч таго, актыўна правяралася законнасць прыцягнення і выкарыстання замежнай працоўнай сілы суб'ектамі гаспадарання розных формаў уласнасці. Па выяўленых парушэннях да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнута больш за 20 службовых асоб.

Як паведаміла ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Міністэрства ўнутраных спраў, за грубае парушэнне правіл знаходжання з краіны выдварана 267 чалавек. Па выяўленых падчас спецмерапрыемстваў злачынствах у дачыненні да замежнікаў было заведзена 28 крымінальных спраў, адна з іх — за арганізацыю незаконнай міграцыі, 25 — за парушэнне тэрміну забароны ўезду ў Рэспубліку Беларусь. Затрымана пяць чалавек, якія былі ў вышуку.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## Алена МІХАЛОЎСКАЯ:

# «ГАЛОЎНАЕ — НАСУПЕРАК УСІМ АБСТАВІНАМ ЗАСТАЦЦА САБОЙ»

**Кажуць, сіла жанчыны ў яе слабасці, але вядучая «Нашых навін» на АНТ Алена Міхалоўская — дакладна прыклад моцнай асобы, прафесіянала, які здольны трансфармавацца, і чалавека, які не ведае і не адчувае ўзросту. Пятнаццаць гадоў у журналістыцы, шматгадовы вопыт працы ў кадры не расчаравалі яе ў выбраным шляху. І тут сакрэт просты: па-першае, нічога выпадковага не бывае; па-другое — толькі ты сам вырашаеш, у якім кірунку рухацца, і нарэшце — мы можам усё, калі ёсць родныя людзі, якія ў нас вераць...**



### Далучылася да «кампаніі»

**— Сёлета вы атрымалі «Тэлевяршыню» як найлепшая вядучая штодзённай інфармацыйнай праграмы. Якія былі ў вас пачуцці і роздумы з гэтай нагоды?**

— Кожны чалавек недзе ў душы спадзяецца на ўдачу і прафесійныя перамогі. Калі Леанарда Ды Капрыа ўручылі «Оскар», то я пажартавала, што і я, значыць, далучуся да яго кампаніі. Спраўдзілася!.. І калі аб'явілі, што я перамагла ў намінацыі «Найлепшая вядучая штодзённай інфармацыйнай праграмы», то гэта было нечакана і разам з тым жадана. Пасля ўзнагароджання да мяне падыходзілі калегі і казалі, што як бы і не ставілся да конкурсу і яго вынікаў, але мая перамога заслужаная.

**Параілася з сям'ёй, і вердыкт быў адназначны: трэба паспрабаваць, каб потым не шкадаваць.**

**— А можаце ўспомніць часы вучобы, калі толькі пачыналі асвойваць сённяшнюю прафесію?**

— На факультэце журналістыкі БДУ я вучылася на завочным аддзяленні. І ў нас усё праходзіла, як і ў большасці студэнтаў: жылі ад сесіі да сесіі. Прыдумлялі нейкі свой алгарытм, каб пазбегнуць перасдач. А паміж гэтым у кожнага ў жыцці адбываліся важныя перамены, бо хтосьці выходзіў замуж, іншыя станавіліся бацькамі, і калі мы сустракаліся, то мелі магчымасць дзяліцца сваімі навінамі. Я была дастаткова старанная студэнткай, аднак нават не думала, што застануся ў прафесіі, буду працаваць па спецыяльнасці і трапліву на тэлебачанне.

**— Спачатку вы апынуліся ў выдавецтве «Беларуская энцыклапедыя»...**

— Той перыяд я прайшла, калі яшчэ была студэнткай і трэба было недзе працаваць. Змагла знайсці месца ў выдавецтве ў аддзеле гісторыі Беларусі. Тут памятаю ўсе тамы «Савецкай энцыклапедыі», якую мы рэдагавалі... Аднак менавіта людзі, з кім працавала поплеч, стварылі незвычайную атмасферу. Мае старэйшыя таварышы былі вельмі цікавымі асобамі — разумнымі, інтэлігентнымі, гатовымі ў любы момант прыйсці на дапамогу. Ад іх чула мноства павучальных гісторый з жыцця. І я вельмі ўдзячная лёсу за сустрэчы з такімі людзьмі.

**— Потым была праца на радыё, на беларускім тэлебачанні і ад'езд у Маскву. Там пасля кастынгу вам адразу прапанавалі працу. Ганарыліся ў той момант, што ў вас за плячыма беларуская школа журналістыкі?**

— Прысутнічала такое пачуццё. Бо мяне заўважылі і разгледзелі. Як бы пафасна тое ні прагучала, але я была ў тым крэсле на кастынгу, маё аблічча ў кадры і маю працу ацэньвалі. І я зразумела, што мы самі не з гліны злепленыя.

### Ніякай руціны!

**— Памятаеце, неяк вы сказалі, што з пазіцыі гледача сённяшнім маладым журналістам вы не даввяраеце. У чым, на ваш погляд, прычына, і як ратаваць становішча?**

— Ведаеце, я яшчэ застала выдатных рэжысёраў, гукарэжысёраў і іншых спецыялістаў, з якімі проста пабыць побач і пачуць іх парады было за шчасце. Ім я вельмі ўдзячная, што ўсе яны былі ў маім жыцці і дапамаглі мне фарміравацца як прафесіяналу. І, можа, гэта маё суб'ектыўнае ўспрыманне, але што датычыцца маладых, то зараз шмат тых, хто адкрыта займаецца самалюбаваннем. Раз з'явіўся на тэлеэкране, і ты на вяршыні. А раней з'яўленне на экране было толькі першым крокам, калі ты разумееш, што ўсё толькі пачынаецца і наперадзе цябе чакае вялікая праца над сабой. Цяпер жа ўсё наадварот успрымаецца, нібы гэта пік кар'еры і ты ўжо ўсё ўмееш... Але нельга забываць, што глядач павінен даваряць табе настолькі, каб не ўзнікала жадання пераключыцца на іншую праграму. Ён усе дробязі памятае, і камера цябе нібы скануе. Там не схаваеш сваёй няшчырасці, акцёрства.

**— Калі вярталіся з Масквы, ці была ўпэўненасць, што зможаце адчыніць перад сабой любыя дзверы?**

— Вярнуўшыся, я зразумела, што не святыя гаршкі лепяць. І ні тут, ні там ніхто зорак з неба не хапае. Дакладна ведала адно — як спецыяліст абавязкова знайду сабе прымяненне. Прыемна вяртацца з багажом новых ведаў і ўжо не глядзець знізу, а быць на адным узроўні з калегамі-прафесіяналамі.

**— Як тэлевядучая вы спрабавалі сябе ў розных жанрах і фарматах. Цяпер зноў працуеце з навінамі. Не ўзнікае адчування руціны?**

— Быць вядучай навін — гэта элітны ўзровень у тэлежурналістыцы, і тут ты як прафесіянал па-за канкурэнцыяй. Я сапраўды спрабавала сябе ў розных жанрах і разумею, што проста выдатна, калі спецыяліст здольны трансфармавацца. Зараз ужо год працую ў «Нашых навінах» на тэлеканале АНТ і цалкам задаволена. Унікальная асаблівасць маёй прафесіі ў тым, што нічога не паўтараецца! Кожны эфір — гэта новыя перажыванні, эмоцыі і ніякай руціны.

### Не марнуйце энергію

**— Жыццё ў расійскай сталіцы змяніла, мабыць, ваша стаўленне не толькі да прафесіі, але і да сям'і...**

— Той час быў сапраўдным выпрабаваннем. Прычым, калі я атрымала запрашэнне на працу, то не пагадзілася з першага разу. Адмовіўшыся, я вельмі здзівіла масквічоў, але для сябе проста вырашыла: калі гэта мой шанц, то мне зробяць прапанову зноў. І праз месяц так і адбылося. Параілася з сям'ёй, і вердыкт быў адназначны: трэба паспрабаваць, каб потым не шкадаваць. Было цяжка жыць на два гарады і перажываць радасці, горасці, святы на адлегласці ад сям'і. Добра, што сёння ёсць «скайп» і можна штодня быць на сувязі... А там, калі ты з'язджаеш у іншы горад, у іншую краіну, і гэта Масква, дзе ў цябе наогул няма ніякіх знаёмых, то адчуваеш сябе мурашкай. І ў адносінах з мужам для такога кроку неабходны давер. У нас часцей думаюць: як гэта ён цябе адпусціў? А ў Маскве мне жанчыны казалі: мужыка трэба берагчы, як ты не пабаялася яго пакінуць? Ведаю, што майму мужу тут некаторыя спачувалі, бо лічылі, што я яго кінула з дзецьмі і паехала ў Маскву ў пошуках лепшага жыцця. І гэта смех скрозь слёзы, бо толькі мы ведаем, што давялося перажыць. Аднак набыты вопыт дазволіў кожнаму з нас зрабіць высновы і цяпер на многія рэчы мы глядзім значна прасцей. Ніхто ўжо не высвятляе адносін з-за таго, ці прыгатаваныя катлеты і чыя чарга выносіць смецце. Не варта распыляцца і марнаваць жыццёвую энергію не на тое і не на тых.

**— У вас дзве дачкі. Нехта з іх праяўляе цікавасць да вашай прафесіі?**

— Пакуль ніхто з іх не заводзіў пра гэта гаворку. Толькі я час ад часу кажу, што не хацела б, каб мае дзеці працавалі ў журналістыцы. Гэта не самая лепшая прафесія для жанчыны. Ёсць шмат магчымасцяў для маладых людзей, і мне здаецца, мае дочкі змогуць больш паспяхова рэалізавацца ў іншых сферах.

**Ёсць адна выдатная прымаўка: калі ў цябе няма таго, што ты любіш, то любі тое, што маеш.**

**— Што лічыце самым неабходным для будучыні сваіх дзяцей?**

— Самае галоўнае, каб мае дочкі сустрэлі сваіх адзіных, з кім яны будуць шчаслівымі ў каханні. Бо я нават у сваім акружэнні бачу шмат прыкладаў самастойных і паспяховых жанчын, але яны адзінокія. А вельмі важна, каб побач быў чалавек, які дазволіць жанчыне адчуць сябе слабай. І, безумоўна, мне важна, каб яны былі ўпэўненымі ў заўтрашнім дні.

**— А самі якія каштоўныя ўрокі засвоілі, калі азірнуцца на жыццё з пазіцыі сённяшняга дня?**

— Я досыць балюча перажываю здрады блізкіх людзей, якія, на жаль, здараліся. Аднак разумею, што да жыцця варта ставіцца мудра. Ёсць адна выдатная прымаўка: калі ў цябе няма таго, што ты любіш, то любі тое, што маеш. Памятаю, неяк раніцай ехала на эфір і паскардзілася таксісту, маўляў, як цяжка рана ўставаць. А ён мне сказаў: раніца — гэта выдатна, асабліва калі разумееш, што аднойчы яна для цябе не наступіць. Таму трэба шанаваць кожнае імгненне і цаніць тое, што мы маем. Бо галоўнае, каб блізкія нам людзі былі здаровыя і мы насуперак усім абставінам змаглі застацца самімі сабой.

**Алена ДРАПКО.** *drapko@zviazda.by*

■ Класічнае шоу!

# ЮРЫЙ ГАРАДЗЕЦКІ Ў «ВЯЛІКАЙ ОПЕРЫ»

**Ужо ў верасні ў тэлевізійным праекце «Вялікая опера» мы будзем перажываць за беларускага тэнара Юрыя Гарадзецкага. Два гады таму ў такой жа ролі мы назіралі беларуса Ілью Сільчукова, які дайшоў да фіналу і заняў трэцяе месца.**

Восенню і зімой нас чакаюць 11 незабыўных выпускаў праграмы на расійскім тэлеканале «Культура», а 24 снежня ўбачым грандыёзны фінал, дзе, ёсць спадзяванне, прыме ўдзел і беларускі артыст. На гала-канцэрт, што пройдзе на сцэне Маскоўскай кансерваторыі, будуць запрошаны ўсе ўдзельнікі праекта.

Арганізатары «Вялікай оперы» гэтым разам паспрабавалі ахапіць усе тэатры на постсавецкай прасторы, таму даслалі запрашэнні ў многія нацыянальныя оперы. У тым ліку і ў Вялікі тэатр Беларусі. Тут вырашылі, што ўдзельнікам ад нашай краіны будзе Гарадзецкі.

— А што мне заставалася? Толькі пагадзіцца, — каментуе з усмешкай Юрый. — Для мяне ўдзел у праграме — забаўка, як і любы падобны тэлевізійны праект. Але гэта вельмі добрае і якаснае шоу, якое толькі папулярызуе опернае мастацтва. Ну і, вядома, прыносіць папулярнасць усім яго ўдзельнікам. Безумоўна, у першую чаргу я патэлефанаваў Ілье Сільчукову. Ён быў на гастролях у Францыі, парадаваўся за мяне і параіў: «Нават не думай — удзельнічай!» І даў некалькі парад. Парэкамендаваў «не мудраваць» і браць толькі вядомыя творы. Мне ўжо даслалі тэмы праграм: тут і руская/савецкая опера, і італьянская класіка, і рамансы, і праграмы, прысвечаныя Галіне Вішнеўскай, Джузэпэ Вердзі, Пятру Чайкоўскаму... Думаю, што ж узяць для перадачы, тэма якой — «Візітная картка»?.. Ніводзін мой канцэрт яшчэ не абыходзіўся без раманса Немарына з «Любоўнага напою» Даніцэці. А з арыяй Ленскага з «Яўгена Анегіна» Чайкоўскага я дэбютаваў у тэатры 10 гадоў таму. Так што выбіраць ёсць з чаго. Галоўныя мае хваляванні



звязаныя менавіта з тым, што ўрэшце на нейкіх творах трэба будзе спыніцца...

Хоць сам Юрый не строіць вялікіх планаў, не думае, ці пераможа ў гэтым праекце, мы зычым тэнару Вялікага тэатра Беларусі ўдачы!

**Алена ДРАПКО.** *drapko@zviazda.by*

■

## Аўторак, 19 ліпеня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.45** Зона Х. Крымінальная хроніка.
**9.10 Камедыя «Спатканне».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00, 20.00 Серыял «Грачанка».**
**12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.15 Серыял «Ліст чакання».**
**14.25** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Простае жыццё».**
**17.35 Дэтэктыў «Апошняя сустрэча».**
**19.20, 0.05** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Спецыяльны рэпартаж.
**0.40** Дзень спорту.
**0.50 Серыял «Дзявочае паляванне».**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
